КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 1 (224) ◂ 7 студзеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ІНТЭРВ'Ю З ВІТАЛЕМ РЫМАШЭЎСКІМ**

Стар. 6

**ПАДАРУНКІ НА КАЛЯДЫ**

Прайшоў цікавы 2010 год — год спадзяванняў і расчараванняў. Надышоў 2011-ы. З чым Беларусь у яго ўступіла?

Стар. 3

**ЗАХАД У ШОКУ**

Замежныя палітыкі працягваюць даваць ацэнку падзеям 19 снежня ў Беларусі

Стар. 11

**КРЫЖЫ ЮРКІ МОНІЧА**

Стар. 14

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ІРЫНА ЖЫХАР**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# СВЯТА Ў АСАБЛІВЫХ УМОВАХ

*Аляксей КАРОЛЬ*

**«Мне здаецца, што ў гэтым годзе мы святкуем Каляды неяк асабліва, — абмовіўся Аляксандр Лукашэнка 27 снежня мінулага года на сустрэчы з архібіскупам Тадэвушам Кандрусевічам. — Я адчуваю, і настрой зусім іншы…» Рэдкі выпадак, калі мусіш пагадзіцца. Сапраўды так. На жаль. І на бяду.**




Напад спецкаманды сілавых структур увечары 19 снежня, яшчэ да заканчэння выбараў, на групу кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева, яго збіццё да беспрытомнасці, з наступным арыштам і выкраданнем са шпіталя. Брутальны разгон мітынгу на плошчы Незалежнасці. Дзясяткі збітых да крыві, сотні арыштаваных і асуджаных.

Хваля масавых вобшукаў і арыштаў, у наступныя, аж да навагодняга свята, дні. Без перадыху нават на 25 снежня — дзень Раства Хрыстова. Дзень спакою і радасці. Дзень узаемадаравання. Дзень шчаслівых пажаданняў і надзей.

Сотні людзей адсвяткавалі Раство і сапраўды «асабліва» — за кратамі. А 27 з іх — яшчэ з большай асаблівасцю — у знакамітай «амерыканцы», унутранага СІЗА КДБ, пад пагрозай быць асуджанымі на тэрмін ад 5 да 15 гадоў зняволення па ч. 1 і 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (арганізацыя і ўдзел у масавых беспарадках). Сярод іх 5 кандыдатаў у прэзідэнты: Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч, Аляксей Міхалевіч, Уладзімір Някляеў, Віталь Рымашэўскі. І хаця апошні адпушчаны з турмы пад падпіску аб нявыездзе, абвінавачванне з яго не знятае. Па тым жа абвінавачванні, але ў статусе падазраваных, пад падпіскай, знаходзяцца яшчэ два кандыдаты — Рыгор Кастусёў і Дзмітрый Ус. 7 з 9 кандыдатаў. Інакш чым расправай над апанентамі, гэта не выглядае.

У чым жа пралічыліся ўтрымальнікі ўлады? Што перапоўніла іх чашу цярпення? Адказ знойдзем у выказваннях А. Лукашэнкі. Да выбараў: «Пацерпім яшчэ два тыдні». «Плошчы не будзе». І адразу пасля выбараў, пасля разгону плошчы: «Вы, як і я, адчулі, што мы такую дэмакратыю тут развялі, што далей няма куды».

Як часта гучалі сцвярджэнні аналітыкаў аб страху, што пранізвае беларускае грамадства ці не на генетычным узроўні. І гэта — так. Аднак хапіла літаральна пару месяцаў лёгкага аслаблення аўтарытарных абцугоў, каб дух свабоды адціснуў дух страху на ўзбочыну грамадскай свядомасці. Хапіла выступаў альтэрнатыўных кандыдатаў у наўпроставым эфіры, каб у прапагандысцкай завесе маны з'явіліся непапраўныя прарэхі.

Для самога рэжыму адкрылася, што рэпрэсіямі і прапагандай не ўдалося нейтралізаваць ні грамадскія арганізацыі, ні незалежныя СМІ, што не хапіла ні БРСМ, ні сацыяльных падачак і саступак, ні шчодрых абяцанак, каб схіліць на свой бок патрэбную частку грамадства. Што збоі пачала даваць нават адпрацаваная працэдура датэрміновага галасавання, і рэальны працэнт бюлетэняў «за» адзінага палітыка істотна не дацягнуў нават да ўзроўню 2006 года.

Выбарчая кампанія паказала, што сацыяльны баланс, які гарантуе любому таталітарнаму ці аўтарытарнаму рэжыму ўстойлівасць, пагрозліва пахіснуўся. Гэта ўсяго толькі абавязковы прапагандысцкі таталітарны міф, што правадыра, айца народа, любіць і шануе ўсё грамадства, увесь народ, уся нацыя. На самай справе, такім рэжымам патрэбна, каб частка грамадства сапраўды іх падтрымлівала, частка сапраўды любіла і пакланялася, а частка папросту баялася і маўчала. Ну і, зразумела, патрэбна машына рэпрэсій у звязцы з прапагандысцкай, якія мусяць працаваць бесперапынна. Збоі — смерці падобныя.

А тут адкрылася, што слой адданых вельмі вузкі, што сацыяльны пакет — замалы, а рэсурс вычарпаны, што рэпрэсіі патрэбнага эфекту не далі, а прапаганда струхлела. Што ў рэжыму няма прывабнай ідэалогіі. Усё гэта і адчула ўлада, калі не розумам, дык інстынктам. І таму: спецназ — на плошчу, агонь дубінкамі. Галоўнае камандаванне ўзяў на сябе А. Лукашэнка, аб чым сам засведчыў на прэсавай канферэнцыі 20 снежня.

Плошча–2010 у колькасці ад 20 да 40 тысяч чалавек — гэта стыхійны ўсплёск сацыяльнай энергіі пратэсту. Прычым людзей новых, якія на мітынгі не хадзілі. Розных узростаў, але пераважна маладых. Рэжым прайграў новае пакаленне, якое пры гэтым рэжыме і вырасла. Арганізаваная апазіцыя даўно ўжо, а кандыдаты падчас кампаніі, збіралі на свае вулічныя акцыі не больш за 2 тысячы.

Разам з тым Плошча–2010 акумулявала ў сабе і энергію антыталітарнага прарыву пачатку 1990-х, і пратэсту Плошчы–2006. Нішто не праходзіць бясследна. Плошча–2010 адбылася б і без заклікаў кандыдатаў. Аднак іх учынак, іх выхад на плошчу дадаў масавасці, а ім самім вярнуў павагу грамадства ў яго дэмакратычным сегменце (а ён немалы, калі нават улада вымушана была аддаць ім 20% галасоў) і выклікаў спачуванне як да ахвяр у большасці насельніцтва.

Гвалт плошчы з наступнай хваляй рэпрэсій ёсць не што іншае, як адчайная спроба рэжыму вярнуць сацыяльны баланс уласнай устойлівасці. Найперш баланс страху і, праз прапаганду, даверу да сябе, дакладней, веры, хаця б і безнадзейнай, у сваю моц і непахіснасць. Часткова гэта ўдалося ў асяродку маўклівай большасці, якая глядзіць беларускія тэлеканалы. Там многія паверылі, што на плошчы былі хуліганы. Але каб паверыла пераважная большасць, такія акцыі павінны надзейна прыкрывацца поўнай інфармацыйнай блакадай.

Працяг на стар. 2 ▸

АД РЭДАКТАРА

# СВЯТА Ў АСАБЛІВЫХ УМОВАХ

◂ Працяг. Пачатак на стар. 1.

Гэтую вайну за розумы рэжым прайграў. Нягледзячы на спробы блакавання мабільнай сувязі і інтэрнэта, сеціва запоўнена відэа і фота, па якіх не цяжка аднавіць сапраўдны ход падзей, выявіць сапраўдных правакатараў, арганізатараў і выканаўцаў як «штурму» Дома ўрада, так і ўсёй аперацыі па зачысткі плошчы.

Гучаць меркаванні аб нечаканасці такога фіналу выбараў. Ці ж такая ўжо нечаканасць? Па сутнасці, у беларускага аўтарытарнага рэжыму, як і любога іншага, ёсць толькі два варыянты самазахавання. Ці паступовая трансфармацыя ў больш-менш дэмакратычную мадэль, ці вяртанне да класічнай формы жорсткага аўтарытарызму. Шлях па першаму непазбежна вёў да аслаблення асабістай улады А. Лукашэнкі, з пагрозай замены яго на пэўным этапе новай фігурай. Як ён калісьці замяніў Кебіча. Таму Лукашэнка другі варыянт. Але толькі пасля таго, як атрымаў на тое індульгенцыю ў Маскве.

Тут спрацавала другая асаблівасць беларускай мадэлі аўтарытарнага рэжыму, адбудаванай на сколку былой савецкай таталітарнай сістэмы, але не ў рамках агульнай вялікай дзяржавы, а як асобная, незалежная дзяржава. А значыць, і з вельмі абмежаваным запасам унутраных рэсурсаў. Беларускі аўтарытарны новатвор апынуўся непасрэдна паміж Усходам і Захадам. І, зразумела, што дадатковы рэсурс ён вымушаны быў прасіць у Расіі, па традыцыйнай схеме ў палітычна роднаснага яму рэжыму. А вось контраргументы на рэалізацыю сваіх амбіцый на самастойнасць вымушаны быў шукаць у палітычнай гульні ў лібералізацыю з Захадам. І на тым пратрымаўся 16 гадоў.

Можна меркаваць, што А. Лукашэнка выйграў і гэты раўнд сваёй барацьбы — на плошчы. Але ці надоўга? Ці не пірава гэта перамога? Так, Мядзведзеў і Пуцін выдалі яму карт-бланш на працяг яго ўладарання ў Беларусі, вярнуўшы частку эканамічных прэферэнцый у абмен на падпісанне ўсяго пакета дакументаў па АДКБ, па фарміраванні агульнай эканамічнай прасторы. А па сутнасці, у абмен не проста на палітычную лаяльнасць, а на поўную палітычную васальную залежнасць. З дазволам, па трапнаму выказванню аднаго з расійскіх палітолагаў, праводзіць «лібералізацыю, дзе можна, а рэпрэсіі — дзе трэба».

Але, падаецца, карт-бланш гэты не на бестэрміновае ўладаранне. Дый ці ж можа змірыцца з такой роляй сам беларускі ўладар? Адначасова брутальны разгром Плошчы–2010 калі і не цалкам перакрыў яму магчымасці гульні на Захад, то, відавочна, усур'ёз перарваў.

І дзе браць рэсурс, калі Расія прыменіць рыначны механізм разліку па нафце і газу? І дзе, калі Захад прыменіць санкцыі на продаж нафтапрадуктаў у краінах ЕС? Тут і сыравіна з Расіі не дапаможа. І нікуды не падзелася сацыяльная энергія пратэсту, энергія да перамен. Безумоўна, нас чакае нялёгкі год пад скрыгат аўтарытарнага маятніка, але гэтую энергію, гэтую беларускую пагоню да свабоды ўжо не спыніць, не стрымаць.

ПА-ЗА ЗАКОНАМ

# РЭКОРД ПА ПЕРАТРУСАХ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Дэмакратычных актывістаў 4 і 5 студзеня напаткала новая хваляператрусаў. А разам з тым і выклікаў у КДБ. Пабіты ўсе ранейшыя рэкорды па колькасці вобшукаў цягам аднаго дня.**

Пасляператрусу офіса «Вясны» па кватэрах праваабаронцаў пайшлі супрацоўнікі КДБ. Тры прадстаўнікі гэтага ведамства правялі 4 студзеня ў Мінскуператрус у прыватным доме праваабаронцы Насты Лойкі. «Вобшук цягнуўся каля дзвюх гадзін. Узялі як «доказы» старыя ўлёткі, нічога іншага не было ў хаце. Як яны сказалі: «Падрыхтавалася», — паведаміў кіраўнік праваабарончага цэнтра «Вясна» Алесь Бяляцкі.

Ён адзначыў, што Наста зараз удзельнічае ў кампаніі дапамогі ахвярам палітычных рэпрэсій. «І, мабыць, такім чынам яна патрапіла ў поле зроку КДБ», — мяркуе Алесь Бяляцкі. Адразу пасляператрусу Насту Лойку павезлі ў КДБ, дзе дапыталі па справе 19 снежня ў якасці сведкі.

Супрацоўнікі КДБ правяліператрус на кватэры маладзевага актывіста Андрэя Прасняка. Канфіскаваны ноўтбук і 26 кампакт-дыскаў. У актывіста Аляксандра Пяткевіча падчас вобшуку супрацоўнікі КДБ канфіскавалі кампутар і носьбіты інфармацыі. На наступны дзень прызначылі допыт. КДБ правёў ператрус у офісе сустаршыні БХД Георгія Дзмітрука ў Кобрыне. Забралі кампутар і выклікалі на допыт 5 студзеня.

Ператрусы напаткалі сябра перадвыбарнага штабу Уладзіміра Някляева — Святлану Навумаву, а таксама даверанную асобу кандыдата — Ніну Пахлопку. Узялі нэтбук, флэшкі, дыск з песнямі на вершы Някляева, і СД-дыскі, якія забіралі і падчас ператрусу ў маі 2010 года. Прайшоў таксама ператрус у тэлеаператара «Белсату» Алеся Баразенкі, канфіскаваны ноўтбук. Адразу пасля гэтага яго забралі на допыт у следчы камітэт МУС.

Ператрэслі і офіс БХК, раніцай 5 студзеня.

Лідар прадпрымальнікаў Алесь Макаеў не паспеў нават прыехаць дадому пасля 15 сутак арышту. Гэтым днём ён толькі выйшаў з жодзінскага ізалятара за ўдзел у акцыі салідарнасці 20 снежня, а яму пра намер правесці ператрус паведаміла жонка. Дома былі двое дзяцей, якія не пусцілі супрацоўнікаў КДБ. Як паведаміў на той момант «Радыё Свабода» Алесь Макаеў, ён едзе дадому і ўжо на месцы будзе разбірацца ў прычынах патрабаванняў КДБ.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# У НАС ПАКУЛЬ ЛЕПШ, ЧЫМ У ЧАЧНІ

Вольга ХВОІН

**У краіне з апошніх дзён снежня працуе місія Камітэта міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.**



Андрэй Юраў

Стварыць камітэт вырашыла кааліцыя з некалькіх дзясяткаў няўрадавых арганізацый краін АБСЕ 27 снежня 2010 года. Камітэт займаецца маніторынгам і кантролем за сітуацыяй з выкананнем фундаментальных правоў чалавека, сітуацыяй з праваабаронцамі і СМІ. На працягу сваё працы ўдзельнікі місіі мусяць выпрацаваць рэкамендацыі для нацыянальных органаў улады і наднацыянальных структур па нармалізацыі сітуацыі ў краіне і прывядзенні яе ў строгую адпаведнасць з унутранымі нормамі і міжнароднымі абавязальніцтвамі, узятымі на сябе ўрадам Беларусі. Місія не ацэньвае вынікі выбараў прэзідэнта і ход іх правядзення.

«Прыцягваюць увагу факты масавага парушэння правоў людзей падчас іх затрымання і адбыцця імі адміністрацыйных пакаранняў. Нашы калегі з Беларусі сабралі мноства адпаведных фактаў, таму можна гаварыць пра масавыя парушэнні. І калі ў краіне не было ўведзена надзвычайнае становішча, то ўсе затрыманні і арышты мусілі праводзіцца ў межах Працэсуальнага кодэкса, — сказаў на прэс-канферэнцыі ў Мінску сябра місіі, Савета пры прэзідэнце Расійскай Федэрацыі па спрыянні развіццю грамадзянскай супольнасці і правах чалавека, Экспертнага Савета пры Нацыянальным упаўнаважаным па правах чалавека (Амбудсмане) Расійскай Федэрацыі Сяргей Крывенка. — З'явіліся факты пераследу за ўдзел у мітынгу: адлічэнні студэнтаў, урачоў, што працуюць па размеркаванню звальняюць за прагулы пасля адміністрацыйнага арышту. Ёсць перашкоды для працы адвакатаў. Міжнародная супольнасць не можа прайсці міма гэтых фактаў».

Сяргей Крывенка заявіў, што пастараецца ўсю сабраную інфармацыю па Беларусі перадаць у Савет пры прэзідэнце Расіі па спрыянні развіццю грамадзянскай супольнасці і правах чалавека, а таксама данесці да расійскіх сродкаў масавай інфармацыі.

Кіраўнік доўгатэрміновай Міжнароднай назіральнай місіі Андрэй Юраў, які таксама з'яўляецца сябрам шэрагу афіцыйных міжнародных арганізацый, заявіў, што ў працы місіі не ўдзельнічаюць беларускія праваабаронцы, каб была магчымасць захаваць нейтралітэт, а таксама каб пакінуць шанцы на сустрэчу з прадстаўнікамі ўлады.

«Мы гатовыя сустрэцца і паслухаць іх меркаванні», — зазначыў Юраў. Місія ўжо распаўсюдзіла дзве заявы, датычныя фактаў, што затрыманым — гаворка найперш пра кандыдатаў, журналістаў, што цяпер знаходзяцца ў СІЗА КДБ, — рэгулярна не аказваецца медыцынская дапамога, што па міжнародных стандартах прыраўноўваецца да катаванняў; хвалі вобшукаў у праваабаронцаў, ціску на адвакацкую супольнасць, а таксама ў сувязі з закрыццём офіса АБСЕ.

«Мы прапанавалі ініцыяваць маскоўскі механізм: калі адбываюцца нейкія падзеі, што выклікаюць агульную занепакоенасць, то можа быць накіраваная назіральная місія АБСЕ. Нам важна, каб іншыя міжнародныя структуры стварылі адэкватны інструмент маніторынгу і ўплыву на беларускую сітуацыю», — сказаў Андрэй Юраў.

Параўноўваючы сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі і Расіі, праваабаронцы зазначылі, што «Расія яшчэ да такога не дайшла, за выключэннем рэгіёна Чачні». «Але гаварыць, што ў Расіі сітуацыя з правамі чалавека лепшая, чым у Беларусі, няправільна. Бо на еўрапейскай частцы Расіі, на Урале гэта больш прыстойна, але ў той жа Чачні ў сотню разоў горш», — падкрэсліў Андрэй Юраў.

САЛІДАРНАСЦЬ

# СПЫНІЦЬ РЭПРЭСІІ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**«Еўрапейскія дэмакратычныя студэнты» (ЕДС) выступілі з патрабаваннем вызваліць палітвязняў у Беларусі. Найбуйнейшая ў Еўропе студэнцкая арганізацыя асудзіла рэпрэсіі беларускіх уладаў супраць удзельнікаў акцыі 19 снежня.**

Адмыслова для абмеркавання сітуацыі ў Беларусі была склікана Цэнтральная Рада ЕДС. Падчас яе пасяджэння, як адзначыў кіраўнік ЕДС Бэнс Бауэр, былі абмеркаваны канкрэтныя захады па дапамозе беларускай супольнасці. А таксама прыняты дзве заявы — адносна прэзідэнцкіх выбараў і жорсткага разгону мірнай акцыі ў Беларусі, і адносна крымінальных спраў супраць старшыні Маладога фронту Змiцера Дашкевіча і яго паплечнікаў. Пра гэта паведаміла прэс-служба польска-беларускай моладзевай ініцыятывы «Дэмакратычны інстытут», якая распаўсюдзіла тэкст заяў.

ЕДС заклікала неадкладна вызваліць усіх грамадзян Беларусі, затрыманых як прэвентыўна, так і пасля дэманстрацыі 19 снежня. А таксама «спыніць іх крымінальны і адміністрацыйны пераслед, адмовіцца ад усіх палітычна матываваных абвінавачанняў».

Адмысловую заяву ЕДС прыняла з патрабаваннем спыніць рэпрэсіі супраць Маладога фронту. Гэта адзіная беларуская моладзевая арганізацыя, якая з'яўляецца паўнапраўным сябрам ЕДС.

Нагадаем, што арганізацыя «Еўрапейскія дэмакратычныя студэнты» (European Democrat Students) заснаваная ў 1961 годзе прадстаўнікамі ўніверсітэтаў Заходняй Еўропы. Яна налічвае ў сваіх шэрагах больш за 500 тысяч студэнтаў з 37 арганізацый-сябраў у 32 краінах Еўропы. ЕДС таксама з'яўляецца асацыяваным сябрам Еўрапейскай народнай партыі і прызнанай грамадскай арганізацыяй пры Радзе Еўропы.

ФАКТ

# ПАД ПРЫМУСАМ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Напярэдадні Новага года давялося ехаць цягніком нумар 137 Мінск—Гродна. Пасля праверкі білетаў правадніца зноў пайшла па вагону.**

У гэты раз яна задарма раздавала кожнаму пасажыру газету «СБ Беларусь сегодня». Якасны каляровы друк. На першай старонцы фатаздымак Лукашэнкі і надпіс: «Выбар зроблены. Ідзем уперад». Большасць пасажыраў вагона адмаўлялася па такога прэзэнта. Тады правадніца клала газету ім на стоік. На працягу пяці гадзін язды давялося пабачыць аднаго чалавека, які зацікавіўся газетай. На запыт, ці раздача адбывалася ва ўсіх вагона, правадніца адказала так: «Куды мы дзенемся. Інакш застанешся без працы».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПАДАРУНКІ НА КАЛЯДЫ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Прайшоў цікавы 2010 год — год спадзяванняў і расчараванняў. Надышоў 2011-ы. З чым Беларусь у яго ўступіла? Што чакаць ад гэтага года? Пэўна, такім пытаннем задаюцца не толькі астролагі, але і ўсе грамадзяне краіны. Ну, давайце паглядзім.**



Пасля маштабнай «зачысткі» ўжо адпушчаныя амаль усе, прысуджаныя да «сутак». Зараз яны адмываюцца, адаграюцца ды пішуць нататкі ці вольныя сачыненні пад назвай «Як я сустрэў каталіцкія Каляды і Новы год». Але ж міліцыя не спыняецца. Здаецца, іх дэвізам зараз стала «Ані дня безператрусу». Колькасць канфіскаванай аргтэхнікі перавысіла сотні, калі не тысячы штук. І будзе яшчэ большай.

У поўнай запарцы працуюць следчыя КДБ. Адвакаты тыднямі не могуць пабачыць сваіх падабаронных, бо ўсе пакоі для допытаў занятыя. Такі імпэт следства розных узроўняў праяўляла хіба толькі пасля выбуху на свяце ў Дзень незалежнасці ў 2008 годзе. Але ж варта зазначыць, што тады ані масавыя ператрусы, ані масавыя допыты, ані масавая дактыласкапія выніку не далі — «падрыўнікоў» так і не знайшлі. Цікава, што атрымаецца зараз.

Але выпускаюць не толькі «сутачнікаў», як не дзіўна. Са следчага ізалятара КДБ адпушчаны два падазроныя па справе аб масавых беспарадках у Мінску 19 снежня — былы кандыдат у прэзідэнты Віталь Рымашэўскі і Андрэй Дзмітрыеў, кіраўнік выбарчага штаба Уладзіміра Някляева. Абодва выпушчаны пад падпіску аб нявыездзе.

Рымашэўскага выпусцілі з СІЗА ў ноч на 1 студзеня пасля таго, як ён напісаў растлумачальную запіску на імя Аляксандра Лукашэнкі. Дзмітрыева адпусцілі раніцай 3 студзеня. Дзмітрыеў паведаміў, што не пісаў ніякіх зваротаў і тлумачэнняў на імя Лукашэнкі.

Абодва «сядзельца» далі падпіску аб неразгалошванні таямніцы следства. Абодва планавалі правесці прэс-канферэнцыі. Але пасля таго, як з КДБ Рымашэўскаму «пагразілі пальчыкам», сказаўшы, што прэс-канферэнцыя будзе расцэненая як парушэнне падпіскі і экс-кандыдат зноў апынецца ў СІЗА КДБ, Рымашэўскі ад правядзення мерапрыемства з прэсай адмовіўся. Даведаўшыся пра гэта, адмовіўся і Дзмітрыеў. Што, дарэчы, не перашкаджае ім сустракацца і размаўляць з прэсай асобна, без правядзення нейкіх прэс-канферэнцый.

Асабліва ўсіх цікавіла, што ж такога напісаў Рымашэўскі Лукашэнку, каб адразу апынуцца на волі? Рымашэўскі, здаецца, і меў намер адказаць на гэтае пытанне на прэс-канферэнцыі. Але пасля таго, як яе адмянілі, рабіць тое не стаў. Ён хіба толькі пацвердзіў журналістам, што пісаў гэты ліст, аднак не пісаў нічога, што б магло пашкодзіць іншым зняволеным. Між тым, ён заспакойвае сваіх паплечнікаў. «Хачу сказаць усім сваім нядобразычлівцам: «Не радуйцеся», а ўсім сваім прыхільнікам: «Не хвалюйцеся». Мая пазіцыя да 19 снежня, 19-га і пасля 19-га засталася нязменнай. І ніякія лісты, ніякія тлумачэнні, ніякія мае сведчанні не супярэчылі гэтай пазіцыі. Я гатовы несці адказнасць за свае словы і перад Богам, і перад людзьмі», — падкрэсліў палітык.

Больш за тое, ён паведаміў, што мае намер звярнуцца да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай пра асабістую сустрэчу. «Спадзяюся, што змагу сказаць усё, што я хачу сказаць, асабіста Лукашэнку», — адзначыў Рымашэўскі.

Вось толькі захоча сам Лукашэнка пачуць ад свайго былога і даволі радыкальнага апанента «пару ласкавых»?

А Дзмітрыеў увогуле ў нейкіх «непанятках». «Ніякіх зваротаў і тлумачэнняў я не пісаў. Я не ведаю, чаму мяне вызвалілі. Паклікалі, далі падпісаць абавязацельства, што я абяцаю не выязджаць з Беларусі і выконваць усе крымінальна-працэсуальныя дзеянні. І ўсё», — сказаў Дзмітрыеў у інтэрв'ю «Радыё Свабода».

Непрыемную навіну акурат напярэдадні Новага года атрымала і АБСЕ. 31 снежня 2010 года афіцыйны Мінск аб'явіў, што мандат офіса АБСЕ ў Мінску на наступны год не будзе працягнуты. «Гэта ўсвядомленае рашэнне, абумоўленае адсутнасцю аб'ектыўных падстаў для захавання місіі АБСЕ ў Беларусі. Гэтая пазіцыя на працягу шэрагу гадоў выкладалася ў афіцыйных заявах беларускага боку», — заявіў прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных.

Гэта яшчэ больш ускладніць кантакты Беларусі з Захадам і ЗША. Увогуле, нельга раздражняць і без таго раздражнёную сусветную супольнасць. Канешне, старшыня АБСЕ Літва пачала нефармальныя кансультацыі для аднаўлення працы мінскага офіса. Але ёсць і іншыя «званочкі».

Аляксандру Лукашэнку і дзясяткам афіцыйных асоб, адказным за рэпрэсіі пасля выбараў, будзе забаронены ўезд у краіны Еўрасаюза. Пра гэта заявіў кіраўнік МЗС Швецыі Карл Більт у інтэрв'ю бельгійскаму выданню «EUObserver». «Мы павінны трымацца логікі нашай жа палітыкі, — сказаў дыпламат. — У мінулы раз, калі больш не было палітычных зняволеных, мы зрабілі пазітыўныя крокі (адмянілі забарону на ўезд у ЕС шэрагу беларускіх чыноўнікаў). Зараз жа маецца значна больш палітычных зняволеных, і тыя, хто садзейнічалі гэтаму, павінны вярнуцца назад у спіс».

Што яшчэ змянілася? Стаўкі акцызаў на алкагольныя напоі ў Беларусі з 1 студзеня 2011 года павышаны ў сярэднім на 7–8%. Алкаголь падаражэе. З 1 студзеня 2011 года Польшча адмяняе консульскі збор за нацыянальную візу для грамадзян Беларусі. Прашу заўважыць — гэта нацыянальная віза, а не «шэнген». За «шэнген» па-ранейшаму давядзецца плаціць напоўніцу.

Адначасова з 1 студзеня 2011 года грамадзяне Беларусі могуць працаўладкоўвацца ў Польшчы без афармлення дазволаў на працу. Згодна з новымі правіламі, для працы ў Польшчы грамадзянам названых краін дастаткова мець толькі дакумент ад работадаўца, які пацвярджае працаўладкаванне.

З 1 студзеня 2011 года Беларусь можа закупляць расійскія нафту і нафтапрадукты без выплаты пошлін. Але ў абмен на бяспошлінныя пастаўкі нафты беларускі бок павінен пералічваць у бюджэт РФ увесь аб'ём экспартных пошлін на нафтапрадукты, якія вывозяцца з яе тэрыторыі за межы Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі.

І, што асабліва важна, 4 студзеня ў Беларусі набылі моц папраўкі ў Правілы дарожнага руху. Згодна з новай рэдакцыяй ПДР, да аўтамабіляў прыраўноўваюцца квадрацыклы (мотакаляскі). Пад квадрацыклам (мотакаляскай) разумеюцца чатырохколавыя механічныя транспартныя сродкі, якія маюць прывады кіравання аўтамабільнага тыпу і масу ў сабраным стане не больш за 550 кілаграмаў. Для кіравання такім транспартным сродкам неабходна мець вадзіцельскае пасведчанне катэгорыі В.

Скутарыстам дазволена перавозіць пасажыра, калі тэхніка прадугледжвае для яго спецыяльна адведзенае месца, а таксама калі пасажыр старэйшы за 12 гадоў. Для кіравання такой тэхнікай, якая класіфікуецца як мапеды, з аб'ёмам рухавіка да 50 куб. см будуць неабходныя правы катэгорыі АМ. Аб'ём рухавіка больш за 50 куб. см кваліфіке транспарт як матацыкл, для выкарыстання якога неабходныя правы катэгорыі А1 (аб'ём да 120 куб. см) або катэгорыі А.

Папраўкі ў ПДР рэгламентуюць дзеянні пасажыраў аўтатранспартных сродкаў у выпадку ДТЗ. Раней гэта не было дакладна прапісана. Зараз пасажыр абавязаны аказваць першую дапамогу пацярпелым.

Новыя ПДР даюць супрацоўнікам ДАІ права блакіраваць колы аўтобусаў і грузавых аўтамабіляў масай да 3,5 тон, калі гэтыя транспартныя сродкі прыпаркаваныя не па правілах.

Удачы на дарогах!

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ



Аляксандр Лукашэнка зрабіў кадравыя перастаноўкі. Прэм'ер-міністрам Беларусі прызначаны Міхаіл Мясніковіч. Савет міністраў на чале з Сяргеем Сідорскім, у адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі, прыняў пастанову аб складанні паўнамоцтваў перад зноў абраным прэзідэнтам. Лукашэнка адстаўку прыняў, праўда, новыя прызначэнні ён зрабіў яшчэ да прысягі і чарговай інаўгурацыі. Кіраўнік дзяржавы таксама прызначыў першым намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра Сямашку, намеснікамі прэм'ер-міністра — Анатоля Калініна, Сяргея Румаса, Валера Іванова, Анатоля Тозіка.

Новы прэм'ер-міністр Беларусі Міхась Мясніковіч ужо даручыў дапрацаваць праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011–2015 гады. Чыноўнік указаў на сістэмныя недахопы распрацаванага дакумента. У прыватнасці, як адзначае саўмінаўская прэс-служба, падыходы, закладзеныя ў праекце праграмы, не забяспечваюць дастатковых тэмпаў нарошчвання беларускага экспарту для выхаду да 2014 года на нулявое сальда знешняга гандлю.

Акрамя таго, праект праграмы не адпавядае асноўным палажэнням дырэктывы №4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь», а таксама Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі.

З 2001 года Мясніковіч працаваў прэзідэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Да гэтага ён займаў высокія пасады ў дзяржаўным апараце, у тым ліку намесніка прэм'ер-міністра, кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта.

Былы кіраўнік беларускага ўрада Сяргей Сідорскі мае намер прыкладна на паўгода адысці ад актыўнай працы і заняцца сваім здароўем. «Радыё Свабода» перадае, што верагодным працягам працы Сяргея Сідорскага стане пасада пасла Беларусі ў Кітаі.

### МІКАЛАЙ СТАТКЕВІЧ



Экс-кандыдат у прэзідэнты Мікалай Статкевіч больш за два тыдні трымае галадоўку ў СІЗА КДБ. Палітык не гаварыў аб сваіх патрабаваннях, але сэнс яго галадоўкі — адмена вынікаў прэзідэнцкіх выбараў з-за іх фальсіфікацыі. Спыняць галадоўку ён намеру не мае.

Адвакат Таццяна Станкевіч бачыла Мікалая Статкевіча толькі калі прад'яўлялася абвінавачванне. «Сам Мікалай Статкевіч галадоўку не спыніць. Гэта яго ўнутраныя прынцыпы і перакананні. Ён галадаў бы ў любым выпадку — ведаў бы пра гэта ўвесь свет або ніхто б не даведаўся», — цытуе словы паплечнікаў палітыка інтэрнэт-рэсурс «Беларускі партызан».

Новай інфармацыі аб стане здароўя Мікалая Статкевіча, падрабязнасцяў па яго справе няма. Няма і інфармацыі аб змешчаных у СІЗА КДБ сябрах ініцыятыўнай групы Статкевіча Аляксандру Арастовічу і Сяргею Марцалеву. Усе яны абвінавачваюцца ў арганізацыі масавых беспарадкаў.

### ТАДЭВУШ КАНДРУСЕВІЧ



Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч 3 студзеня адзначае 65-гадовы юбілей. З гэтай нагоды ў архікатэдральным касцёле Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску адбылася ўрачыстая імша. Архіпастыра павіншавалі святары, вернікі, прадстаўнікі ўлады. З юбілеем Тадэвуша Кандрусевіча павіншаваў кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Тадэвуш Кандрусевіч — ураджэнец Гродзеншчыны. Святарскае пасвячэнне атрымаў у 1981 годзе. З 1999 года з'яўляецца сапраўдным сябрам (акадэмік) Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі. Уваходзіць у спецыяльную раду па Еўропе пры Генеральным сакратарыяце Сінода Біскупаў, у Кангрэгацыю па справах духавенства, а таксама ў Папскую раду «Iustitia et Pax». З'яўляецца віцэ-прэзідэнтам Еўразійскага аддзялення Міжнароднай асацыяцыі рэлігійнай свабоды.

Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч быў прызначаны новым кіраўніком Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкай царквы восенню 2007 года. Да гэтага прызначэння пасаду апостальскага адміністратара Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі з 14 чэрвеня 2006 года займаў Антоній Дзям'янка. У Беларусі біскуп Тадэвуш Кандрусевіч заснаваў Гродзенскую вышэйшую духоўную семінарыю, спрыяў вяртанню і адкрыццю больш чым 100 раней закрытых касцёлаў, распаўсюджванню беларускай мовы ў касцёле. Цяпер рыхтуецца падпісанне пагаднення паміж Апостальскай сталіцай і Рэспублікай Беларусь.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ЗРАБІЎ ТОЙ, КАМУ ВЫГАДНА

Сяргей НІКАЛЮК

**Сцэнар Плошчы, які столькі гадоў рыхтавала беларуская апазіцыя, на жаль, быў не адзіным.**



Не буду хаваць: падзеі, якія адбыліся ў ноч з 19 на 20 снежня, сталі для мяне поўнай нечаканасцю. Больш за тры гады, з восені 2007-га, аўтары «беларускай эканамічнай мадэлі» спрабавала перавесці сваё тварэнне з прасёлкавай дарогі «адмысловага шляху» на ліберальныя рэйкі. Зразумела, рабілі яны гэта не ад любові да заходніх каштоўнасцяў. У той год Расія ў два разы павялічыла кошт на газ. Вынік не прымусіў сябе доўга чакаць. Ужо да жніўня знешнегандлёвае сальда замест планавага плюсу ў 0,5 мільярда паказала пазапланавы мінус у 1,2 мільярда, і не ў рублях, а ў заморскіх «тугрыках».

Грозныя каманды, якія рэтрансляваліся з вяршыні ўладнай «вертыкалі», былі бяссільныя перад імпартам, што нарастаў. Эканамічнае быццё паставіла кіроўную эліту краіны перад фактам: так далей жыць нельга. На нашых вачах пачаў раскручвацца махавік чарговай перабудовы. А тут яшчэ сусветны крызіс…

Тым, хто не падзяляе настолькі смелага сцвярджэння, рэкамендую перачытаць даклад «адзінага палітыка» (АП) на IV Усебеларускім народным сходзе: *«Достигнутое — мощный фундамент для инновационного прорыва». «Человеческий капитал — двигатель модернизации страны». «Следующая пятилетка станет периодом обновления, нацеленным на качественно новое развитие Беларуси»*. Гарбачоў з яго паскарэннем праз развіццё машынабудавання тут і побач не стаяў.

## Інаватары ў камуфляжы

Правесці эканамічную лібералізацыю ў чыстым выглядзе яшчэ ніхто не здолеў. Я не ведаю, ці знаёмы АП з працамі аўстрыйскага эканаміста Іосіфа Шумпетэра, але аўтар тэрміна «інавацыя» разумеў пад інавацыямі не любыя новыя тэхналогіі, а толькі тыя, што змяняюць жыццё. Масавае ўкараненне інавацыйных тэхналогій за кошт цэнтралізаванага імпарту забяспечыць нельга, таму што акрамя прапановы інавацый не меней важны попыт на іх. А гэта ўжо пытанне культуры, пытанне каштоўнасцяў. Нездарма ў ЦК КПСС так і не атрымалася прывязаць воз навукова-тэхнічных дасягненняў да рэальнай эканомікі. І гэта нягледзячы на велізарную колькасць пастаноў, прынятых у свой час на Старой плошчы.

Бессэнсоўна закладаць *«фундамент для инновационного прорыва»* і ва ўмовах канфрантацыі з Захадам. Адсюль імкненне правесці выбары *«по самым демократичным стандартам»*. Адсюль прызнанне, што *«их легитимность для нас важнее, чем для кого бы то ни было в мире»*, якое парадаксальным чынам было спалучана з нежаданнем дзеля гэтага прызнання *«ползти на корячках»*.

Але тры гады, выдаткаваных на паляпшэнне бізнэсклімату ў краіне, з мэтай прыцягнення замежных інвестараў, ды яшчэ плюс паўтара гады на наданне дэмакратычнага глянцу выбарчай сістэме, пайшлі кату пад хвост. *«Для этого понадобилось семь с половиной минут»* і некалькі пармейску выразна аддадзеных каманд, пасля якіх натрэніраваныя маладыя людзі ў камуфляжы прыступілі да выканання аперацыі пад кодавай назвай *«Палкой по голове»*.

У I стагоддзі рымскі юрыст Касіян Равіла абяссмерціў сваё імя фразай «Is fecit, qui prodest» («Зрабіў той, каму выгадна»). Ён рэкамендаваў суддзям пры разглядзе справы заўсёды шукаць, каму можа быць выгадна дадзенае злачынства. Па яго меркаванні, гэты шлях разваг вёў да выяўлення ці самога злачынца ці таго, хто за ім стаіць. Скарыстаемся парадай рымскага юрыста, каб паспрабаваць зразумець, каму было выгадна перакрэсліць трохгадовыя высілкі па закладцы падмурка для *«инновационного прорыва»*.

## Таталітарызм цяпер дарагі

Я не прылічваю АП да бенефіцыяраў аперацыі *«Палкой по голове»*. У чым яго выгада? У тым, каб нагадаць апазіцыі, а заадно і Маскве, хто ў беларускай хаце гаспадар? Але палітычныя дывідэнды ад такой аперацыі здольныя перавысіць выдаткі толькі пры ўмове, што апазіцыя ўяўляе рэальную пагрозу для Улады. Такое магчыма ў некансалідаваных аўтарытарных рэжымах, а гэта не наш выпадак. Аналіз «каляровых рэвалюцый» гэтая выснова пацвярджае (гл. «НЧ».

Палітыка «закручвання гаек», выхад на якую, на першы погляд, такі лагічны пасля падзей 19 снежня, — задавальненне не з танных. Спашлюся на аўтарытэт істытуцыянальнага эканаміста Аляксандра Аузана: «Таталітарызм, наогул, даволі дарагая рэч. Давайце мы пачнём з таго, што вы наўрад ці можаце прывесці прыклад краіны, дзе быў бы таталітарны рэжым і не было б фізічна абсталяванай мяжы. Немагчыма ціснуць на насельніцтва, калі яго не змясцілі ў кансервавы слоік. А гэты кансервавы слоік каштуе вельмі дорага».

Калі эканамічна актыўныя беларусы не здольныя паўплываць на Уладу, запаўняючы бюлетэні, то гэта яшчэ не азначае, што ім не пад сілу ціснуць на яе, галасуючы нагамі. Нагадаю чытачам «НЧ», што напярэдадні сусветнага крызісу Улада апынулася ўцягнутай у своеасаблівую «гонку заробкаў» з Расіяй. Інакш утрымаць працаўнікоў (у першую чаргу будаўнікоў) усярэдзіне тэрыторыі з ганарлівым імем Беларусь было немагчыма. Атрымаўся своеасаблівы аналаг суперніцтва Элачкі Людаедкі з Вандэрбільдзіхай, з настолькі ж пераканаўчымі шанцамі на поспех.

## Добрыя весткі не аплачваюцца

Паспрабуем адшукаць бенефіцыяраў снежаньскіх падзей з дапамогай азбукавых паліталагічных ісцін. Чым больш жорсткая ўладная «вертыкаль», тым у большай залежнасці ад свайго найбліжэйшага асяроддзя апынаецца той, хто знаходзіцца на яе вяршыні. Звернемся па дапамогу да класіка заходняй палітычнай думкі XX стагоддзя Карла Шміта: «Нават самы абсалютны манарх вымушаны абапірацца на данясенні, і таму залежыць ад сваіх дарадцаў. Незлічонае мноства вестак і фактаў, прапаноў і здагадак навальваецца на яго дзень за днём, гадзіна за гадзінай. З гэтага бясконцага бушуючага мора праўды і хлусні, сапраўднага і верагоднага нават самы разумны і магутны чалавек можа набраць у лепшым выпадку толькі некалькі кропель».

Выснова з такой нярадаснай карціны відавочная: «Хто дакладае ўладару ці паведамляе яму інфармацыю, той ужо мае сваю частку ўлады, усё адно, ці ён міністр, упаўнаважаны візаваць дакументы, ці нехта, хто ўмее непрамым чынам схіляць да сябе слых уладара». Зразумела, што за права дакладаць у асяроддзі ўладара разгортваецца барацьба. Гэта барацьба — стрыжань палітычнага працэсу ва ўмовах кансалідаванага аўтарытарнага рэжыму. Публічным жа палітычным інстытутам, такім, як партыі і парламент, адводзіцца выключна імітацыйная роля. Любыя іх спробы пакінуць імітацыйнае поле і заняцца рэальнай палітыкай успрымаюцца ўладнай «вертыкаллю» ў якасці пагрозы стабільнасці, і таму перарываюцца самым рашучым чынам.

Прэтэндаваць на лаўры пераможца ў першую чаргу можа той, хто дакажа ўладару сваю незаменнасць. А зараз уявіце сабе сітуацыю, калі кіраўнік сілавога ведамства ўвесь час прыносіць добрыя весткі. Шанцаў на дадатковую пайку пры дзяльбе бюджэтнага пірага ў падпарадкаванага яму ведамства, відавочна, ад гэтага не будзе больш. Канкурэнцыя, як бы ні расхвальвалі яе лібералы, далёка не заўсёды вядзе да росту эфектыўнасці. На яе шляху паўстаюць інтарэсы «малых груп», якія асабліва актыўна плодзяцца ва ўмовах непублічнай барацьбы за права дакладваць уладару.

Са сказанага не вынікае, што дакладчыкі валодаюць неабмежаванымі магчымасцямі для маніпуляцый. Па-першае, улады імкнуцца не дапусціць інфармацыйнай манаполіі, для чаго ствараюць паралельныя кіроўныя структуры. Па-другое, шмат што залежыць ад знешняга кантэксту. Пагадзіцеся, ладзіць сілавую аперацыю на плошчы Незалежнасці пасля паўтарагадзіннай маскоўскай сустрэчы тэт-а-тэт, і ў выпадку, калі б такая сустрэча не адбылася, — гэта, як кажуць у Адэсе, дзве вялікія розніцы. Нельга скідаць з рахункаў і асабістыя якасці ўладара.

Паспяховая маніпуляцыя людзьмі — справа, якая патрабуе адмысловых навыкаў. Хтосьці асвойвае іх, вывучаючы Дэйла Карнэгі, хтосьці за лепшае лічыць ісці ад жыцця, але ў любым выпадку вышэйшыя паверхі ўладных «вертыкаляў» займаюць галоўным чынам прафесійныя маніпулятары. Так сцвярджае Азбука паліталогіі.

## Час інвеставаць у будучыню

Схільнасць АП перыядычна ўзмацняць то ўсходні, то заходні знешнепалітычны вектар звычайна тлумачаць сітуатыўнай выгадай. Маўляў, геапалітычны кірунак, у якім можа больш абламацца ў пэўны момант часу, і прынята ў нас у спешным парадку абвяшчаць галоўным. Такога кшталту палітыка «кароткага дыхання» выглядае цалкам лагічнай, аднак яна дрэнна спалучаецца з генеральнай устаноўкай на бестэрміновае кіраванне. Аднымі тактычнымі рашэннямі бестэрміновае кіраванне не забяспечыць, тут патрабуецца іншы, стратэгічны гарызонт.

Звернемся яшчэ раз да дакладу на IV Усебеларускім народным сходзе. У пераліку прыярытэтных кірункаў на першым месцы стаяць *«развитие человеческого потенциала, повышение уровня благосостояния»*. Для такога развіцця і такога падвышэння прадугледжаны *«радикальная модернизация всех отраслей экономики, создание новых наукоемких, высокотехнологичных производств»*. За кошт датацый — не істотна, ці выступаюць яны ў выглядзе танных расійскіх энергарэсурсаў, ці ў выглядзе палёгкавых крэдытаў МВФ, — мадэрнізацыі не правесці.

Апора на палітыку «нафта ў абмен на пацалункі» пры рашэнні задачы па ўтрыманні ўлады відавочна паказала, што тактычныя поспехі былі атрыманыя за кошт стратэгічнай паразы, бо залежнасць немадэрнізаванай «беларускай эканамічнай мадэлі» ад знешніх датацый з гадамі толькі павялічылася.

Істотны ўнёсак у рост гэтай залежнасці дадалі і сацыяльныя абавязанні Улады, якія ўвесь час растуць. Адмовіцца ж ад іх яна не ў стане. Іншага сродку для падтрымання легітымнасці ў арсенале Улады папросту няма.

Усе папярэднія гады Улада інвеставала ў мінулае (пенсіі, сілавікі, аграгарадкі). Сёння рэсурс такой палітыкі вычарпаны. На мінулае цяпер ужо больш няма грошай. Іх неабходна шукаць у будучыні, для чаго трэба перанесці апору з маргінальных сацыяльных груп на тэхнічную і культурную інтэлігенцыю, прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнэсу. У такога пераносу ва ўладнай вертыкалі ёсць не толькі прыхільнікі, але і супернікі. Апошнія, натуральна, пераважаюць. Свае крэатыўныя здольнасці яны і прадэманстравалі 19 снежня.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# У АДНЫМ ШЭРАГУ З ЗІМБАБВЕ

Вольга ХВОІН

**Напрыканцы снежня аптымістам палітычнай будучыні Беларусі стала зразумела, што гэтай самай мройнай будучыні з ліберальна-дэмакратычнай афарбоўкай у дзяржавы няма. Прынамсі не ў дзейсных умовах і не з цяперашнім кіраўніцтвам.**

Спадзяванні (па ўнутраны і знешні бок мяжы Беларусі) на змены ў свядомасці кіруючай вярхушкі былі такія жаданыя і чаканыя, што часовыя паслабленні рэжыму прынялі за чыстыя намеры ступіць на шлях дэмакратыі. Ні пагроз, ні пастак сітуацыі, ні правакацый ніхто не заўважыў. Але 20 снежня, на другі дзень пасля прэзідэнцкіх выбараў, усе спусціліся на зямлю і загаварылі не тое што пра адкат у 2006 год, калі былі масавыя затрыманні і арышты актывістаў апазіцыі, а пра вяртанне ў 1930-я.

Стрыманых, але пазітыўных ацэнак не змаглі пазбегнуць і ўнутраныя назіральнікі. Так, адзін з каардынатараў кампаніі «Праваабаронцы за справядлівыя выбары» Валянцін Стэфановіч канстатаваў падчас адной са прэс-канферэнцый, што «ёсць падставы гаварыць аб пэўнай лібералізацыі палітычнага працэсу». Цяпер, асэнсаваўшы выбарчы і паслявыбарчы перыяд, і назіральнікі, і экс-кандыдаты ў прэзідэнты (якія рабілі падобныя заявы, а цяпер сядзяць у СІЗА КДБ) канстатуюць, што празрыстых, роўных, адпаведных унутраным і міжнародным стандартам выбараў не было.

«Тое, што было выяўлена падчас датэрміновага галасавання — прымус, непразрыстасць, — і падчас падліку галасоў (70 працэнтаў нашых назіральнікаў не змаглі пабачыць, як адбываўся падлік бюлетэняў) паказала, што гэта быў фарс. Ад гэтых выбараў пахне, патыхае фальсіфікацыямі. Таму не дзіўныя вынікі, калі Лукашэнка «атрымаў» 80 працэнтаў, а астатнія кандыдаты паўтара-два працэнты. Увесь гэты пасьянс быў распісаны ў Адміністрацыі прэзідэнта», — гаворыць прадстаўнік кампаніі «Праваабаронцы за справядлівыя выбары» Алесь Бяляцкі.

Спадар Бяляцкі, нягледзячы на крывавае пабоішча 19 снежня ў цэнтры Мінску, аптымістычна ацэньвае тыя падзеі. «Людзі адчуваюць значэнне пасады прэзідэнта ў сістэме кіравання, але яны не згодныя з тым беззаконнем, што адбываецца, і гэта вывела іх на вуліцу. Пагрозы ад вышэйшага кіраўніцтва былі праігнараваныя, гэта ёсць паказчыкам высокай свядомасці грамадства. Мы мяркуем, што ўлады, сілавыя структуры арганізавалі правакацыю — не быў забяспечаны парадак, нікога з сілавікоў не было каля Дома ўраду, тым больш, што міліцыі многа і не патрабавалася, а АМАП сядзеў унутры, пакуль не пачалі біць неабароненыя дзверы. Затым быў непрапарцыйны адказ на гэтыя дзеянні. У 1905 годзе царскія ўлады расстралялі дэманстрацыю рабочых, і вось праз сто гадоў мы пабачылі нешта падобнае. Гэта паказчык страху ўладаў, і іх жорсткасць, што мусіць падавіць грамадскую актыўнасць, — лічыць праваабаронца. — Але ў нас ужо ёсць прышчэпка ад падобных рэчаў, ніхто не разгубіўся, хаця былі пацярпелыя і сярод журналістаў, і сярод грамадскіх дзеячаў, палітыкаў. Я не бачу гэта разгромам грамадзянскай супольнасці. Хутчэй, назваў бы гэта бойкай паміж праўдай і няпраўдай. Хаця сілы няроўныя ў плане рэсурсаў, але на нашым баку маральнасць, праўда, ісціна. Мы гатовыя гэта перажыць».



**Уладзіміру Някляеву**

*Хай не складуць*
*ні песняў,*
*ні санэтаў*
*піїты ўлады —*
*дзеці мітусні,*
*ты ёсць —*
*і будзеш! —*
*Прэзідэнт Паэтаў,*
*бо праўдай змог*
*апосталаў хлусні:*
*што перад Богам,*
*што перад Сусветам,*
*ты палічоны*
*упраўджаным Паэтам.*

**АБАД**

Алесь Бяляцкі з'яўляецца віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай Федэрацыі правоў чалавека, адпаведна, яму ёсць з чым параўноўваць сітуацыю ў Беларусі. Дык вось, аналогіі атрымліваюцца не самыя лепшыя. «Апазіцыя ў нас падкрэслена міралюбівая, і гэта акурат укладаецца ў цывілізаванае разуменне апазіцыі. Яна выступае за мірныя метады прыходу да ўлады, і спробы чыноўнікаў пераканаць, што на Плошчы былі заточкі ды жалезныя штыры не адпавядаюць рэчаіснасці. Яшчэ ад пачатку 1990-х быў абраны мірны шлях барацьбы. Нашая сітуацыя бліжэй за ўсё да Азербайджана, але, магчыма, больш вясёлая, бо грамадзянская супольнасць, як паказалі апошнія падзеі, больш арганізаваная, зітаваная. Што тычыцца агульнай сітуацыі падаўлення іншадумцаў, то мы бліжэй за ўсё да краінаў трэцяга свету. Мы значна адстаём ад краінаў Лацінскай Амерыкі, калі не ўлічваць Кубу, бо там ужо сфарміраваліся пачаткі дэмакратычных асноў. Таму можна ставіць Беларусь у адзін шэраг з Зімбабве, Егіптам, Марока, Тунісам», — рэзюмуе праваабаронца.

Для апазіцыі, праваабаронцаў сутыкненне у цяперашняй сітуацыі хіба што застаецца неабыякавасць нашых суседзяў. Нягледзячы на «мёртвы сезон» у палітыцы, калі Еўропа святкуе Каляды і Новы год, ужо было зроблена многа заяў-асуджэнняў ад прадстаўнікоў парламентаў, кіраўнікоў дзяржаў. «Пачаўся новы палітычны сезон, і пытанне Беларусі будзе разглядацца, абмяркоўвацца. Ніхто не чакаў такіх рэпрэсіўных мераў у дачыненні да апанентаў. Сямёра кандыдатаў сталі падазраванымі ў крымінальных справах, тут няма нічога агульнага з дэмакратыяй, правамі чалавека. Наша дзяржава выклікала шок у цывілізаваным грамадстве», — зазначае Алесь Бяляцкі.

Праваабаронца гаворыць, што паўплываць на кіраўніцтва Беларусі, схіліць яго калі не да дэмакратыі, то хаця б да цывілізаваных дзеянняў магчыма мерамі, якія ў тым ліку прадугледжваюць і санкцыі, эканамічныя абмежаванні: «Мусіць быць ясны празрысты сігнал, што палітзняволеныя павінны выйсці на свабоду, у адваротным выпадку эканамічныя стасункі будуць зведзеныя да мінімуму. Увогуле, да Беларусі пасля снежаньскіх падзей еўрапейскія краіны будуць ставіцца з недаверам, і гэта мае пад сабою грунт. Бо тое, што мы пабачылі, не ўпісваецца ні ў якія межы. Але шмат што залежыць і ад нашага грамадства, мусіць прыйсці разуменне да кожнага, што яго дабрабыт, будучыня залежыць ад улады. Думаю, што адэкватным адказам будуць санкцыі і асуджэнне чыноўнікаў, якія датычныя да ўзурпацыі ўлады, палітычных рэпрэсій».

ПРАГНОЗ

# ЗВАРОТНЫ АДЛІК ДЫКТАТУРЫ

Андрэй РАСІНСКІ

**Бойня напярэдадні Каляд 19 снежня незваротна змяніла краіну. Цяжка пазбавіцца ад пачуцця, што для дыктатуры запушчаны зваротны адлік.**

**10. Адбылося самавыкрыццё жорсткасці і хлусні**

Мірная акцыя пратэсту — і нечуваны люты разгон дэманстрацыі, перадвыбарчая вольніца — і зняволеныя кандыдаты, спадзеў на лепшае — і збіты паэт. У грамадстве — эмацыйны шок ад нечаканай жорсткасці.

Але жорсткасць тлумачыцца хлуснёй, што надарвалася. Цяпер мала хто паверыць у 80% падтрымкі Лукашэнкі на выбарах. Хлусня самаатруцілася. Выйгрышу не было. Спатрэбілася жорсткасць, каб спыніць нарастаючы пратэст.

**9. Рэжым прымяніў сілу, але гэтая сіла стомленая і груваcткая**

Каб разагнаць дэманстрацыю, неабходна мабілізаваць міліцыянтаў ажно з усёй краіны. У Мінску былі сілавікі з рэгіёнаў. Задзейнічалі нават курсантаў. Пры гэтым разгон рэпетаваўся з лета.

У дэманстрантаў не было ані рэпетыцый, ані прадуманай мабілізацыі — і амаль ніякай арганізацыі. Тым не менш, карніцкі апарат на хвілю аслупянеў. У выпадку нечаканасцяў, ён неэфектыўны. Ад доўгага кіравання аднаго чалавека стаміліся і «ахоўнікі парадку».

**8. Мала хто чакаў такую хвалю салідарнасці і такі пратэст супраць падману**

Такіх масавых дэманстрацый, калі людское мора затапіла праспект, Беларусь не бачыла з 1990-х гадоў. Пратэстны патэнцыял быў яўна недаацэнены, але яму не хапіла арганізацыйнай абгорткі.

**7. Калядны разгон выклікае аналогіі з Ірадавай бойняй, якую той учыніў, каб захаваць уладу**

Ёсць зло — і ёсць дабро. Цяпер ёсць яшчэ мірная месцічы — і ёсць натоўп карнікаў.

**6. Жанравы аргумент. Беларуская дыктатура блізіцца да развязкі. Гісторыя, якую пішуць людзі і Бог, зарыфмоўваецца**

Месяц таму з Аляксандрам Фядутам мы абмяркоўвалі жанр беларускай сучаснасці. Трагедыя? Камедыя? Трагікамедыя? Трагіфарс?

У любым выпадку пачатак перагукаецца з фіналам.

Аляксандр Фядута, роўна як і Анатоль Лябедзька, якія прывялі да ўлады Аляксандра Лукашэнку, сёння ў турме.

У 1996 годзе пасля пратэстаў былі асуджаны глуханямы, які «выкрыкваў антыдзяржаўныя лозунгі». Сёння яго схапілі зноў.

У свой час Мясніковіч ахайна здаў Кебіча «народнаму прэзідэнту». Цяпер Мясніковіч вярнуўся — прэм'ер-міністрам.

Стрэльба ўжо вісіць на сцяне. Яна мусіць выстраліць.

**5. З жанравым аргументам цесна перагукаецца аргумент матэматычны**

Ад кульмінацыі да развязкі — адлегласць кароткая. Роўна — як ад пачатку гісторыі да завязкі. Лукашэнка прыйшоў да ўлады ў 1994 годзе — і праз два гады атрымаў абсалютную ўладу.

Ад Каляднай бойні і да фіналу — падобна, таксама два гады.

**4. Наступны аргумент — сонечны**

На сёлетні і два наступныя гады прыпадае сонечны пік. Але і максімум сацыяльнай актыўнасці падпарадкоўваецца гэтым 11-гадовым пікам. Пры гэтым для Беларусі — найбольшыя закалоты адбываюцца не ў кожную сонечную актыўнасць, а праз хвалю.

Апошняя такая хваля прыпала на пачатак 1990-х. Цяпер яна вяртаецца — узмоцненая і падбадзёраная.

Нават калі ўся апазіцыя зняволеная — ад сацыяльных пратэстаў не ўцячы. Але гэтыя сацыяльныя пратэсты будуць раптоўнейшымі і бескантрольнымі.

**3. Аргумент вонкавы — таксама не на карысць дыктатуры**

Захад атрымаў аплявуху, а Расія марыць пра эканамічныя гешэфты, у якіх Лукашэнка ўжо не патрэбны. Прынамсі, віншаванне Мядзведзева выглядала сарамлівым, а расійскія тэлеканалы не спынялі жорсткія рэпартажы пра беларускага аўтакрата.

**2. Ва ўмовах, калі вонкавыя ўмовы для дыктатуры — неспрыяльныя, а пратэсты ў краіне пагражаюць выбухнуць бескантрольна, наменклатуры важна захаваць сваю маёмасць і статус**

Лукашэнка ў гэтых раскладах стаецца лішнім.

**1. Аргумент эканамічны, які ляжыць на паверхні**

На 2012 год прыпадаюць асноўныя выплаты па пазыках. Адначасова беларуская эканоміка патрабуе рэформаў, але сур'ёзных інвестыцый з Захаду не прадбачыцца.

Пры гэтым любы крок рэжыму толькі пагаршае сітуацыю. Скупка маёмасці Расіяй ды мясцовай наменклатурай знясілье жорсткую вертыкаль, а тармажэнне прыватызацыі пагражае прадпрыемствам калапсам. Абодва варыянты рабочым прыязнасці да рэжыму не дадаюць.

Масавыя акцыі пратэсту ў незалежнай Беларусі пачыналіся рабочымі страйкамі.

Выглядае, што гісторыя так ці інакш зарыфмуецца.

Зваротны адлік для дыктатуры пайшоў.

ІНТЭРВ'Ю

# Віталь Рымашэўскі: НЕСЦІ АДКАЗНАСЦЬ І РАЗУМЕЦЬ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА

**Экс-кандыдат у прэзідэнты Віталь Рымашэўскі ў ноч на 1 студзеня быў выпушчаны са следчага ізалятара КДБ пад падпіску аб нявыездзе, пасля таго, як ён напісаў тлумачальную запіску на імя Лукашэнкі. 4 студзеня палітык планаваў даць прэс-канферэнцыю, але ў КДБ папярэдзілі, што калі яна адбудзецца, то Рымашэўскага зноў адправяць у СІЗА. Але сустрэцца з журналісткай Вольгай Хвоін для кароткага інтэрв'ю Віталь пагадзіўся. Тым не менш і пасля інтэрв'ю пытанні засталіся.**





— Я даў некалькі каментараў, пасля гэтага мяне выклікалі ў КДБ і сказалі, што ў любы момант мера ўтрымання можа быць зменeная, і я зноў буду знаходзіцца ў СІЗА КДБ. Што мне не дадуць правесці прэсавую канферэнцыю, што любыя каментары на тэму майго вызвалення, на тэму ўсяго, што звязана з абставінамі 19-га, будуць расцэненыя як парушэнне падпіскі, спробы ўмяшацца ў ходу следства. Калі б тое, што я хацеў сказаць на гэтай прэсавай канферэнцыі, магло б істотна паўплываць на сітуацыю, я б гэта агучыў, нягледзячы на забароны. У дадзеным выпадку я не бачу ў гэтым сэнсу. Хачу паўтарыць усім сваім нядобразычлiўцам — не радуйцеся, а тым, хто мяне падтрымлівае, сваім паплечнікам — не хвалюйцеся. Сутнасць маёй пазіцыі да 19-га, 19-га і цяпер не змянілася, і ніякія вусныя і пісьмовыя мае заявы гэтай пазіцыі не пярэчылі. Хто хоча, хай яшчэ раз праслухае, што я казаў на тэлебачанні, падчас сустрэчаў, там усё ёсць.

***— Якім чынам можна пераламіць сітуацыю, што склалася ў краіне?***

— Пераламіць сітуацыю, якая склалася ў нашай краіне, трэба неадкладна. Яшчэ раз пераконваюся ў слушнасці тых заклікаў, што рабіў падчас кампаніі. Надзея на рэальныя змены ў Беларусі не ў лідарах, не ў тых, хто лічыць сябе элітай — якой заўгодна, журналісцкай, палітычнай, — а ў тых людзях, якія праявілі здольнасць да салідарнасці, самаарганізацыі. Я быў вельмі ўражаны, здзіўлены ўзроўнем арганізаванасці гэтых людзей, калі выйшаў на свабоду. Гэта мяне прыемна ўразіла. Надзея на іх. Ні адзін учынак, які не грунтуецца на любові, не мае права на існаванне. Я гэта ведаў заўсёды, і цяпер ведаю яшчэ больш. У тым ліку і ў палітыцы. Шлях да выпраўлення, паляпшэння сітуацыі, свабоды, незалежнасці, да Беларусі лягае ў любові. Да гэтай краіны, да людзей.

Змяніць сітуацыю ў краіне можна тады, калі мы будзем жыць і дзейнічаць па-іншаму. Я казаў, што агрэсіі і злосці мы мусім супрацьпаставіць салідарнасць, духу нянавісці — дух міру. Я гэта казаў да 19-га і паўтараю зараз. Нават праведны гнеў застаецца гневам, абгрунтаваная злосць — злосцю. Павелічэнне гэтага ў беларускім грамадстве можа прывесці да катастрофы. Змагацца трэба іншымі рэчамі, трэба ўзмацніць беларускую салідарнасць.

***— Падаецца, што Захад урэшце зразумеў сутнасць беларускага рэжыму. Мяркуеце, што жорсткая пазіцыя ЕС паўплывае на змякчэнне палітычнага клімату ўнутры краіны?***

— Я б пажадаў, каб нам з вамі менш здавалася. Калі мы будзем спадзявацца на Еўропу ці Расію, гэта можа скончыцца яшчэ большай катастрофай, чым падзеі 19-га. Не спадзявайцеся на Расію, на Еўропу. Бо ў тым, што адбылося 19-га, ёсць віна і Расіі, і Еўропы. Я б паверыў у шчырасць гэтых намаганняў, калі б нехта пакаяўся ў тым, што рабіў раней. А калі пакаяння няма, то і веры ў шчырасць намераў у мяне няма. Давайце будзем не толькі смелымі і салідарнымі, але і разумнымі, тым больш, калі мы палітыкі.

Усім людзям добрай волі трэба дзякаваць за падтрымку, а з тымі, хто хоча зарабіць з нашага гора палітычныя дывідэнды, трэба быць пільнымі, трымацца асцярожна. На жаль, такія людзі былі і ёсць як унутры краіны, так і за яе межамі. Гэта тыя, хто спрыяў падзеям 19-га. А цяпер крычаць, што сталі відушчымі. Гэта глупства — яны былі відушчымі і ёсць такімі цяпер.

Сумленнай і маючай права на існаванне пазіцыя заходніх краін можа быць тады, калі яны адначасова сумленныя і жорсткія да Расіі. Заклікаю спадзявацца на Бога і верыць у сілы беларускага народа, на іх грунтавацца ў далейшым, звязваць з гэтым лёс нашага народа, краіны.

Каб мы не загульваліся. Многія палітычныя лідары, апазіцыя былі падобныя на маленькую зграйку мышэй, што дзялілі сыр паміж лапамі ў ката. Які цяпер іх проста хлопнуў лапай. Але гэты кот знаходзіцца пад лапамі больш вялікага звера, які цяпер глядзіць і ўсміхаецца. Мы павінны несці адказнасць — вось і ўсё, што я хачу сказаць. Несці адказнасць і разумець, што адбываецца.

***— Вашае вызваленне было чаканым?***

— Я чакаў, што мяне выпусцяць раней. Бо ведаў, што ўсе мае дзеянні былі зафіксаваныя на відэакамеры і незалежных журналістаў, і супрацоўнікаў спецслужбаў. Але, калі прад'явілі абвінавачванне, то зразумеў, што, напэўна, я памыляюся, і сітуацыя можа быць катастрафічнай. Маё вызваленне, думаю, дае надзею на тое, што ўлады могуць адумацца. Асноўнай задачай майго знаходжання тут я бачу дамагацца вызвалення іншых людзей. Я не лічу сябе свабодным і не буду радавацца гэтай свабодзе, пакуль за кратамі застаецца Павал Севярынец і іншыя людзі. Не трэба рабіць з мяне героя — мне казалі: «Ты герой плошчы» — але не таму што я на свабодзе, а нехта сядзіць. А таму, што на плошчы, калі б я быў шараговым чалавекам, то па сваіх дзеяннях я меў бы права быць ушанаваным. Але паколькі я быў лідарам, адным з тых, хто заклікаў на плошчу, то не важна, што я рабіў, важна, чаго я дамогся ці не дамогся. Сваімі дзеяннямі спыніць правакацыі я не змог. Ведаю, што мусіў бы і мог зрабіць больш, як да 19-га, так і 19-га. Пэўна, не толькі я, але адказваю за сябе.

***— Ці стварылі арганізатары плошчы групу, якая б сачыла за парадкам?***

— Мы спрабавалі, але зроблена было мала. Каардынацыі паміж камандамі кандыдатаў амаль не было. У гэтым, лічу, ёсць і мая віна. Калі я падыходзіў да дзвярэй парламента, каб спыніць біццё шкла, то не мог уявіць, што гэтая акцыя скончыцца ў СІЗА КДБ. Я чакаў, што пасля маіх учынкаў нехта выйдзе праз 15 сутак героем, а мяне будуць паліваць брудам. З гэтым пачуццём я падыходзіў да дзвярэй. Калі нехта зараз будзе шукаць у маёй пазіцыі здрадніцтва, то гэта яго справа. Пэўна, калі б мы менш думалі пра свой імідж, а больш — пра людзей, то было б лепш для ўсіх.

***— Якія высновы зрабілі з падзей апошніх двух тыдняў?***

— Уразіў узровень салідарнасці, самаарганізацыі, гэта сапраўды надзея для Беларусі. І абурыла, калі я пабачыў дзеянні некаторых былых-сучасных лідараў беларускай апазіцыі. У мяне толькі адна асацыяцыя. Часам у кватэры жывуць не зусім пажаданыя для гаспадароў жывёлы. І калі гаспадары выходзяць з пакоя, то гэтыя жывёлы вылазяць з усіх шчылін, залазяць на стол, пачуваюцца гаспадарамі. Гэта не палітычная прастытуцыя, гэта паскудства. І ніякія словы пра салідарнасць, пра адзінства не могуць прыкрыць гэтае паскудства, якое проста нельга дапускаць. Я не буду называць прозвішчы, але ўсё відавочна.

Я дарую таму хлопчыку — памятаю твар амапаўца, які мяне біў дубінкай. Ён некалькі імгненняў думаў, калі ўсе пабеглі ад дзвярэй Дома ўраду, і я застаўся. Быў яшчэ адзін чалавек, я не супраціўляўся, хацеў паразмаўляць з кіраўніком АМАПУ, хаця гэта было бессэнсоўна. Я памятаю вочы таго хлопчыка, ён быў разгублены — біць ці не біць, а потым пабачыў у руках мегафон і вырашыў біць. Я яго не віню і дарую, але кожны мусіць вырашаць для сябе сам.

***— Якія ўмовы ўтрымання ў СІЗА КДБ?***

— Я б не хацеў, каб мае словы праектаваліся на іншых, хто ўтрымліваецца ў СІЗА, бо не ведаю, як абыходзіліся і абыходзяцца з іншымі людзьмі. Магчыма, да іх стаўленне іншае. Што тычыцца мяне асабіста, то скажу карэктна, што чакаў намнога горшага, бо турма КДБ мае свой імідж. Калі гаварыць пра медыцынскае абслугоўванне, то пра маё здароўе сапраўды турбаваліся, некалькі разоў вазілі ў клініку КДБ на абследаванне. Мне не паказалі дагэтуль мой дыягназ, але нават калі нешта выпісвалі, то подпісы ставілі тры дактары — яны баяліся браць адказнасць і перапраўлялі па некалькі разоў. Магу сказаць, што яны пра маё здароўе непакоіліся больш, чым я, толькі каб нешта там са мной не сталася.

***— Ці былі пракурорскія праверкі ўмоў утрымання?***

— Інспекцый з пракуратуры я не памятаю. Калі я знаходзіўся ў камеры, інспекцый не было.

***— З кім вы знаходзіліся ў камеры?***

— Магу сказаць, што калі трапіў у камеру, то адбыўся мой кантакт з прадстаўнікамі вышэйшых эшалонаў улады. Падпалкоўнікі, дырэктары заводаў — вось з кім я меў там стасункі. Многае даведаўся пра працу сістэмы. Мы зараз праяўляем салідарнасць, перадусім, канешне, трэба бараніць сваіх. Людзі, якія там сядзяць, напэўна, парушылі закон, але цяпер дадаліся палітычныя, і ім стала яшчэ больш няпроста. Таму калі будуць лішкі пасылак, перадач, то я б заклікаў праявіць салідарнасць і з гэтымі людзьмі.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 10 студзеня, панядзелак

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.45 Навіны.
06.05, 07.10, 08.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
06.45 Nota Bene.
07.05, 08.10, 18.50, 00.55 Зона Х.
07.30, 08.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.30 «У свеце матораў».
09.10 Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
10.10 Здароўе.
10.35 Культурныя людзі.
11.05 Меладраматычны серыял «Маруся».
12.10 Серыял «Сваты-4» (Украіна).
14.10 Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.40 «OFF STAGE LIFE».
16.05 Nota Bene.
16.30 Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
17.25 Меладраматычны серыял «Маруся».
18.25 «Акно ў Еўропу».
19.25 «КЕНО».
19.30 «Арэна». Праграма аб спорце.
19.55 Ход у адказ.
21.00 «Панарама».
21.45 Серыял «Сваты-4» (Украіна).
00.00 Дак. цыкл «Неразгаданая гісторыя».
01.00 Дзень спорту.

06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Контуры.
10.10 «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15 Навіны спорту.
11.10 «Марскі патруль». Шматсер. фільм.
12.20 «Дэтэктывы».
13.10 Кантрольны закуп».
13.45 «Модны прысуд».
14.50 «Зразумець. Прабачыць».
15.25 «Хачу ведаць».
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
17.05 «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
18.20 Меладрама «Прынцэса спецый».
20.00 Час.
21.05 Камедыя «Навагодні дэтэктыў».
23.20 «Залатая калекцыя «Песняроў».
00.50 Начныя навіны.

06.00, 07.30, 09.30, 10.30, 11.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Раніца.Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
08.30 «Тыдзень».
09.35 «Вялікі сняданак».
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 «Багатая і каханая». Тэленавэла.
11.40 «Званая вячэра».
12.30 «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
13.50 Канцэрт М.Задорнава.
15.40 «Далёкія сваякі».
16.00 СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
16.50 «Рэпарцёрскія гісторыі».
17.10 «Наша справа».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Дарослыя гульні». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.30 Фільм «Заселеная выспа: сутычка». Расія, 2009 г.
22.55 Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «Школа дзяржаўнай службы». Дак. фільм.
23.25 Фільм «Кракадзіл Дандзі ў Лос-Анджэлесе». ЗША - Аўстралія, 2001г.

06.35 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Тэлебарометр.
08.05 Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
09.00 Камедыйная меладрама «Ажаніць мільянера!» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
10.45 Школа рамонту.
11.40 «Запал па культуры».
12.25 «Лабірынты гісторыі беларускага фотамастацтва». 3-я частка.
12.50 Серыял «Сіла прыцягнення» (Расія). 1-я серыя.
13.45 « 17-ы Міжнародны фэст цыркавога мастацтва ў Масі». Забаўляльная праграма (Францыя).
14.55 Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
15.30 Пазакласная гадзіна.
15.45 Тэлебарометр.
16.05 Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
16.55 Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
18.00 Прэм'ера. Меладрама «Ты маё жыццё» (Аргентына) 1-я серыя.
19.05 Хакей. КХЛ. Атлант ( Маскоўская вобл.)- Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
21.20 Тэлебарометр.
21.25 Беларуская часіна.
22.25 Камедыйны серыял «Інтэрны».
23.05 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
23.40 Авертайм.
00.10 Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

РОССИЯ

07.00 Мультфільмы.
07.10 Фільм «Афёра Цэпліса».
08.50 «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
09.20 «Ефрасіння». Тэлесерыял.
10.15 «Ранішняя пошта».
11.00 Весткі.
11.15 Надвор'е на тыдзень.
11.20 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 Фільм «Я падарую сабе цуд». 2010 г.
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.15 «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
14.45 «Гарадок». Дайджэст.
15.30 Фільм «Карусель».
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Прэм'ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
17.50 Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
18.50 «Ефрасіння». Тэлесерыял.
19.50 Навіны - Беларусь.
20.00 Весткі.
20.25 Фільм «Выпадковы спадарожнік».
22.10 Юбілейны вечар Р.Паулса.
00.20 «Нічога асабістага».
00.35 Навіны - Беларусь.
00.45 Прэм'ера. «Холад». Дакументальны фільм.

08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
06.30 Камедыйны серыял «Узяць Таранціну».
07.10 «Лепшы горад Зямлі».
08.20 Фільм «Злодзей».
10.20 «Праспявана ў СССР».
11.15 Меладрама «Жыў-быў дзед».
13.15 «Прафесія Рэпарцёр».
13.40 «Рускія сенсацыі».
16.20 «Рускія сенсацыі».
19.30 «Рускія сенсацыі».
22.55 Прэм'ера. Юбілейны канцэрт Б. Маісеева.
00.30 Серыял «Шпіёнскія гульні».

09.30, 12.00 Ралі. Ралі-рэйд. 7-ы этап.
10.00 Снукер. Мастэрс. Дзень 1-ы.
12.30 Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Чэхіі. HS 205.
13.30 Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Мас-старт.
14.00 Біятлон. Кубак свету ў Германія. Жанчыны. Мас-старт.
14.30 Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. Фінал.
15.30 Снукер. Мастэрс. Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
18.30 Снукер. Мастэрс. Дзень 1-ы.
20.00 Футбол. Цырымонія ўзнагароджання лепшага футбаліста года па версіі FIFA. Прамая трансляцыя.
21.15 Ралі. Ралі-рэйд. 8-ы этап. Прамая трансляцыя.
21.50 Вось дык так!!!
22.00 Пра рэстлінг. Агляд WWE.
22.30 Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
23.30, 02.00 Ралі. Ралі-рэйд. 8-ы этап.
00.00 Снукер. Мастэрс. Дзень 2-і.

БЕЛСАТ tv BELSAT

07.00 Тыдзень у «Аб'ектыве».
07.30 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
07.45 Эксперт.
08.05 Рэмарка (культурніцкая праграма).
08.25 Моўнік (лінгвістычная праграма).
08.35 ПраСвет.
09.00 Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Човен спадара Макарона».
09.25 «Дэманстрацыя», дак. фільм, Польшча.
10.35 Фільматэка майстроў: «Пад Кубрыка», маст. фільм, 2005 г., Францыя–Брытанія.
12.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
12.05 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
12.25 Эксперт.
12.45 Рэмарка (культурніцкая праграма).
13.10 Моўнік (лінгвістычная праграма).
13.20 ПраСве.
13.50 Басанож па свеце.
14.15 «Дэманстрацыя», дак. фільм, 1989 г.
15.20 «Minsk-Mixt–2008»: канцэрт гурта «Dali».
15.35 Фільматэка майстроў: «Пад Кубрыка», маст. фільм, 2005 г., Францыя–Брытанія.
17.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
17.05 «Мой родны горад», серыял.
17.30 «Час гонару», серыял: 11 серыя.
18.15 Невядомая Беларусь: «Рок назаўжды–2», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
18.50 Госць «Белсату».
19.10 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
19.30 Калыханка для самых маленькіх.
19.40 Еўропа сёння.
20.10 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Бітва з татарамі пад Клецкам».
20.20 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Я бачыла «Рассвет», дак. фільм, 2000 г., Польшча.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.25 Рэмарка (культурніцкая праграма).
21.45 Фільматэка майстроў: «Пад Кубрыка», маст. фільм, Францыя–Брытанія.
23.10 Аб'ектыў.

## 11 студзеня, аўторак

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.45 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.10, 08.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
07.05, 08.10, 18.50, 00.45 Зона Х.
07.30, 08.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.35 «Арэна». Праграма аб спорце.
09.10 Камедыйная меладрама «Маргоша».
10.10 Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
11.00 Меладраматычны серыял «Маруся».
12.10 Серыял «Сваты-4» (Украіна).
14.05 Ход у адказ.
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.40 Патрабуецца.
16.05 «Апошні аргумент на карысць міру». Дак. фільм (Беларусь). 2-я серыя.
16.30 Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
17.05 Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
17.50 Меладраматычны серыял «Маруся».
19.25 «КЕНО».
19.30 «Сфера інтэрасаў».
19.55 Камедыйная меладрама «Маргоша».
21.00 Панарама.
21.45 Камедыйны серыял «Сваты-4». (Украіна). Заключныя серыі.
00.00 Дак. серыял «Зброя будучыні» (ЗША).
00.50 Дзень спорту.

06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 «Жыць здарова!».
10.25 «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Марскі патруль». Шматсер. фільм.
12.20 «Дэтэктывы».
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Кантрольны закуп».
13.45 «Модны прысуд».
14.50 «Зразумець. Прабачыць».
15.25 «Хачу ведаць».
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
17.05 «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
18.15 Навіны спорту.
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
18.55 «Хай кажуць».
20.00 Час.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Прэм'ера. «Доктар Тырса». Шматсерыйны фільм.
22.05 «Дамастрой. Мяжа цярпення».
23.15 Навіны спорту.
23.20 АНТ прадстаўляе: «Залатая калекцыя «Песняроў».
01.30 Начныя навіны.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца.Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
08.30 «Далёкія сваякі».
08.40 Фільм «Заселеная выспа: сутычка».
10.40 «Багатая і каханая». Тэленавэла.
11.40 «Званая вячэра».
12.35 «Дарослыя гульні». Серыял.
13.50 «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
14.40 «Студэнты International». Серыял.
15.35 «Ваенная таямніца».
16.50 СТБ прадстаўляе: «Школа дзяржаўнай службы». Дакументальны фільм.
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Дарослыя гульні». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.25 Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
21.30 «Вялікі горад».
22.05 «Аўтапанарама».
22.55 «Выкраданне багіні». Серыял.
23.45 «Інструктар». Серыял.

06.35 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Тэлебарометр.
08.05 Камедыйны серыял «Інтэрны».
08.35 Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
09.35 Серыял «Ты маё жыццё». 1-я серыя.
10.35 Камедыйная меладрама «Ажаніць мільянера!» (Расія). 3-я і 4-я ,закл., серыі.
12.25 Камедыя «Начальнік Чукоткі» (СССР).
13.55 Авертайм.
14.25 Серыял «Сіла прыцягнення» (Расія).
15.20 Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
15.45 Пазакласная гадзіна.
16.00 Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
16.50 Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
18.00 Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына). 2-я серыя.
19.05 Камедыя «Начальнік Чукоткі» (СССР).
20.45 Калыханка.
21.00 Тэлебарометр.
21.05 Беларуская часіна.
22.05 Камедыйны серыял «Інтэрны».
22.40 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
23.15 Спорт-кадр.
23.45 Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

РОССИЯ

07.00 «Раніца Расіі».
09.20 «Ефрасіння». Тэлесерыял.
10.10 «Фальшываманетчыкі. Геніі і злыдні». Дакументальны фільм.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Нічога асабістага».
11.45 Юбілейны вечар Р.Паулса.
13.50 Навіны - Беларусь.
14.30 «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
15.25 «Сапраўднае жыццё».
16.15 Тэлесерыял «Дворык».
16.50 Навіны - Беларусь.
17.20 «Кулагін і партнёры».
17.50 Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
18.50 «Ефрасіння». Тэлесерыял.
19.50 Навіны - Беларусь.
20.30 Фільм «Кропля святла».
22.20 Тэлесерыял «Апера. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія. Почырк забойцы».
23.20 Навіны - Беларусь.
23.30 «Весткі.ru».
23.50 «Дзяжурны па краіне».

06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал «НТБ раніцай.
08.40 Серыял «Таксістка».
09.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Следства вялі…».
12.05 «Да суду».
13.30 Серыял «Мянтоўскія войны».
15.10 «Справа густу».
15.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Дэтэктыўны серыял «Эра стральца».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.35 Дэтэктыўны серыял «Павуцінне».
21.30 Баявік «Святаяннік».
23.35 Серыял «Шпіёнскія гульні».

09.30 Ралі. Ралі-рэйд. 8-ы этап.
10.00 Тэніс. Турнір WTA у Аўстраліі 1/8 фіналу.
12.35 Ралі. Ралі-рэйд. 8-ы этап.
13.00 Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Групавы этап. Індыя - Аўстралія.
14.15 Снукер. Мастэрс. Дзень 2-і.
15.30 Снукер. Мастэрс. Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
18.30 Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі. Слалам. Жанчыны. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
19.15 Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Чэхіі. HS 205.
20.00 «Алімпійскія гульні. Лондан». Фехтаванне. Часопіс.
20.05 Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. Фінал.
21.15 Ралі. Ралі-рэйд. 9-ы этап. Прамая трансляцыя.
21.45 Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі. Слалам. Жанчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
22.15 Снукер. Мастэрс. Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
00.00 Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
00.15 Ралі. Ралі-рэйд. 9-ы этап.
00.45 Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Групавы этап. Індыя - Аўстралія.
01.50 Ралі. Ралі-рэйд. 9-ы этап.
02.15 Вось дык так!!!

БЕЛСАТ tv BELSAT

07.00 Аб'ектыў.
07.20 Еўропа сёння.
07.45 Рэмарка (культурніцкая праграма).
08.05 Госць «Белсату».
08.25 Невядомая Беларусь: «Рок назаўжды–2», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
09.00 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Я бачыла «Рассвет», дак. фільм, Польшча.
09.35 «Мой родны горад», серыял.
10.00 «Час гонару», серыял: 11 серыя.
10.45 «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, 2003 г., ЗША.
12.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
12.05 Еўропа сёння.
12.35 Рэмарка (культурніцкая праграма).
12.55 Госць «Белсату».
13.15 Невядомая Беларусь: «Рок назаўжды–2», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
13.50 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Я бачыла «Рассвет», дак. фільм, Польшча.
14.20 «Мой родны горад», серыял.
14.45 «Час гонару», серыял: 11 серыя.
15.35 «Бульбаны», мультсерыял.
15.40 «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, 2003 г., ЗША.
17.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
17.05 «Мой родны горад», серыял.
17.30 «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 19 серыя.
18.25 ПраСвет.
18.55 Моўнік (лінгвістычная праграма).
19.05 Гісторыя пад знакам Пагоні.
19.20 Калыханка для самых маленькіх.
19.25 Праект «Будучыня».
19.55 Форум: «Патрыёты і касмапаліты».
20.40 Беларусы ў Польшчы.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.25 Сальда (эканамічная праграма).
21.40 Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
22.05 «Доктар Марцін», серыял.
22.55 Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 12 студзеня, серада

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.55** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Відэафільм АТН «Подых чашніцкай зямлі» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Камедыйны серыял «Сваты-4» (Украіна). Заключныя серыі.
**14.05** «Славянскі базар». Абранае.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Інфармацыйная праграма «Акно ў Еўропу».
**16.30** «Эпоха».
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Прэм'ера. Драма «Асабістае» (ЗША-Германія).
**00.00** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**01.00** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Марскі патруль». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Доктар Тырса». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Уладзімір Мулявін. Горкае шчасце песняра».
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** АНТ прадстаўляе: «Залатая калекцыя «Песняроў».
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Выкраданне багіні». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «Выкраданне багіні». Серыял.
**23.45** «Інструктар». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё». 2-я серыя.
**10.35** Спорт-кадр.
**11.10** Медычныя таямніцы.
**11.45** Мульфільм.
**12.25** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**12.55** Пазакласная гадзіна.
**13.10** Серыял «Сіла прыцягнення» (Расія). 3-я серыя.
**14.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё». 3-я серыя.
**18.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск)- СКА (Санкт-Пецярбург). Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** «Рэальны свет».
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Касмічныя каскадзёры. 3 рызыкай для жыцця». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Фільм «Кропля святла».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Фільм «Кропля святла».
**22.20** Тэлесерыял «Апера. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія. Почырк забойцы».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Аіда Вядзішчава. Дзесьці на белым свеце...». Дакументальны фільм.

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Следства вялі…».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Мянтоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Эра стральца».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.35** Серыял «Шпіёнскія гульні».

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**10.00** Ралі. Ралі-рэйд. 9-ы этап.
**10.30** Тэніс. Турнір WTA у Аўстраліі. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**14.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі. Слалам. Жанчыны. 2-я спроба.
**15.00** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**17.00** Снукер. Мастэрс. Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Снукер. Мастэрс. Дзень 3-і.
**20.00** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**21.15** Ралі. Ралі-рэйд. 10-ы этап. Прамая трансляцыя.
**21.45** Снукер. Мастэрс. Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**00.00** Ралі. Ралі-рэйд. 10-ы этап.
**00.30** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**02.05** Ралі. Ралі-рэйд. 10-ы этап.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.45** Рэпартэр.
**08.10** Сальда (эканамічная праграма).
**08.30** Форум: «Патрыёты і касмапаліты».
**09.10** «Мой родны горад», серыял.
**09.35** «Два-тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г. , Румынія.
**10.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 19 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Праект «Будучыня».
**12.30** Рэпартэр.
**12.55** Сальда (эканамічная праграма).
**13.15** Форум: «Патрыёты і касмапаліты».
**13.55** «Мой родны горад», серыял.
**14.20** «Два–тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**15.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**15.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 19 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Доктар Марцін», серыял.
**18.15** «Дэманстрацыя», дак. фільм, 1989 г., Польшча.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Пачатак суперніцтва паміж Вільняю і Масквою».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Вагон.
**20.15** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю правы (прававвая праграма).
**21.45** Эксперт.
**22.05** «Сузор'е Паўднёвага Крыжа», камедыя, 2001 г., Аўстралія.
**23.40** Аб'ектыў.

## 13 студзеня, чацвер

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.30** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Відэафільм АТН «Таямніцы зямлі Обраў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Спакуса».
**14.05** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Канцэрт Сары Конар.
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Аляксандр Анісімаў запрашае! Стары Новы год у філармоніі».
**23.45** «Навагодняя ноч на Першым».
**02.30** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 00.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Марскі патруль».Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Доктар Тырса». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Стары Новы год». «Вялікая розніца».
**00.15** Навіны спорту.
**00.20** «Стары Новы год». «Легенды Рэтра FM».
**02.00** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінщчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Выкраданне багіні». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Мюзікл «Чырвоны капялюшык». Расія - Украіна, 2009г.
**00.20** Фільм «Каханне яшчэ быць можа». Расія, 2008г.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё». 3-я серыя.
**10.30** Жансавет.
**11.05** Бітва экстрасэнсаў.
**12.10** «Дача здароўя».
**12.40** Серыял «Сіла прыцягнення» (Расія). 4-я серыя.
**13.35** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**14.05** Пазакласная гадзіна.
**14.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна). 4-я серыя.
**19.05** Камедыя «Гусарская балада» (СССР).
**20.50** Калыханка.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.10** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.45** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. 10.10 «Першая лэдзі савецкага кіно. Тамара Макарава». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Фільм «Кропля святла».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Навагодні Блакітны агеньчык - 2011.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** «Міс Більярда - 2010. Калядны турнір».

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачныя адказ».
**11.20** «Следства вялі…».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Мянтоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Эра стральца».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.15** Сёння.
**23.35** Серыял «Шпіёнскія гульні».

**09.35** Ралі. Ралі-рэйд. 10-ы этап.
**10.00** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**11.15** Тэніс. Турнір WTA у Аўстраліі. 1/2 фіналу.
**13.15** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Групавы этап. Кітай - Катар.
**14.15** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**17.00** Снукер. Мастэрс. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA у Аўстраліі. 1/2 фіналу.
**20.00** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**21.15** Ралі. Ралі-рэйд. 11-ы этап. Прамая трансляцыя.
**21.45** Снукер. Мастэрс. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**00.00** Ралі. Ралі-рэйд. 11-ы этап.
**00.30** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**01.30** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Групавы этап. Кітай - Катар.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.45** Госць «Белсату».
**08.05** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**08.25** Маю правы (прававвая праграма).
**09.50** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**09.10** «Мой родны горад», серыял.
**09.35** «Транзіт», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**10.05** «Сузор'е Паўднёвага Крыжа», камедыя, 2001 г., Аўстралія.
**11.35** «Барды ў Бельску», рэпартаж, 2007 г.
**12.05** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.40** Госць «Белсату».
**13.00** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**13.25** Маю правы (прававвая праграма).
**13.45** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**14.10** «Мой родны горад», серыял.
**14.35** «Gloria victis», рэпартаж, 2008 г., Польшча.
**14.55** «Доктар Марцін», серыял.
**15.45** «Нармальнае жыццё», маст. фільм, 2003 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.30** «Сузор'е Паўднёвага Крыжа», камедыя, 2001 г., Аўстралія.
**19.05** Асабісты капітал.
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** Праект «Будучыня».
**20.05** Вагон.
**20.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Човен спадара Макарона».
**20.40** Хто ёсць кім?: Генадзь Бураўкін.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**22.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Мой Кесьлёўскі», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**23.05** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 16 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.45** Дзень спорту.
**08.00** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальны фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Альманах вандраванняў.
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**12.10** Камедыя «Жаніцьба» (СССР).
**14.10** Відэафільм АТН.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Рамантычная камедыя «Законы прывабнасці» (Вялікабрытанія-Ірландыя).
**17.10** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**18.05** Суперлато.
**19.20** «Вялікая розніца».
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Драма «Незабыўныя моманты» (Швецыя-Данія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая цудоўная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** «Фазэнда».
**11.50** Прэм'ера. «Смак жыцця. Хлеб».
**12.50** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.20** Прэм'ера. «КВЗ. 50 віртуальных гульняў».
**14.15** Фільм «Прыходзьце заўтра».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Белая ноч, пяшчотная ноч…».
**18.10** Камедыя «Артыстка».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: ток-шоў «Кухня».
**21.40** «Якія нашы гады! 1982».
**23.10** Фільм «Рэальнае каханне».

**06.05** Фільм «Старая, старая казка». СССР, 1968 г.
**07.40** Фільм «Леон». Францыя, 1994г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Ідэальны муж». СССР, 1980 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Прэм'ера! Фільм «Апошні шанец Харві». ЗША, 2008 г.
**22.25** Фільм «Мяне тут няма». Германія - ЗША, 2007 г.
**00.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.50** Дабравест.
**08.15** Мір вашай хаце.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.30** Камедыя становішчаў «Як ажаніцца і застацца халастым» (Францыя).
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Школа рамонту.
**11.45** Нашы тэсты.
**12.25** Кінаспробы.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Гаспадар.
**13.25** Бухта капітанаў.
**14.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**14.55** «Халі-галі» .Скетч-шоў.
**15.10** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) - «Поўначсталь» (Чарапавец). Прамая трансляцыя.
**19.20** Смешная часіна.
**19.55** Хакей. Суперфінал Кантынентальнага кубка.
**21.55** Тэлебарометр.
**22.15** Культасвет.
**22.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Тотэнхем- Манчэстэр Юнайтэд.

**РОССИЯ**

**07.00** Мультфільмы.
**07.40** «Навагодні парад зорак».
**09.20** Фільм «Што хавае каханне». 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Ранняя іржа».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка раманса». Гала-канцэрт.
**16.30** Камедыя «Стары Новы год». 2-я серыя.
**17.50** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Музычная камедыя «Марозка».
**23.05** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.05** Вострасюжэтны фільм «Хавайся!». 2010 г.

**НТВ**

**07.30** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рускі Галівуд: Дыяментавая рука-2».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. «Таямнічая Расія: Іншапланецяне ў Растове-на-Доне?».
**14.10** Фільм «Я цябе люблю».
**16.00** Сёння.
**16.20** Псіхалагічны дэтэктыў «Рэквіем для сведкі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.35** Камедыйная меладрама «Прыгажунчык Алфі».
**22.30** «Суперстар».
**00.20** «Зроблена ў СССР».

**EUROSPORT**

**09.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Японіі. HS 134.
**10.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі. Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі. Мужчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Санкавы спорт. Кубак свету. Жанчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**13.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі. Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.15** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**15.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Чэхіі. Спрынт. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**16.15** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**16.55** «Снежны выходны». Агляд. Часопіс.
**17.00** Снукер. Мастэрс. Фінал. Прамая трансляцыя.
**19.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Японіі. HS 134.
**20.00** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Мужчыны. Гонка пераследу.
**20.30** Біятлон. Кубак свету ў Германія. Жанчыны. Гонка пераследу.
**21.00** Снукер. Мастэрс. Фінал.
**22.00** Снукер. Мастэрс. Фінал. Прамая трансляцыя.
**01.00** Ралі. Ралі-рэйд. Агляд.
**01.30** Тэніс. Лепшыя моманты сезону WTA. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Турнір Вялікага шалома. Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** «Арол: крымінальная сага», серыял: ч. 3, 2 серыя.
**08.35** «Чароўнае дрэва», серыял.
**09.05** Калыханка для самых маленькіх.
**09.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.45** Навігатар.
**10.05** «Універсітэт у выгнанні», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**10.30** Вагон.
**10.35** «Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**11.00** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Катарга», дак. фільм, 2001 г., Расія.
**11.30** МакраФон.
**11.50** Форум: «Pick-up і child-free».
**12.30** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма).
**12.50** Еўропа сёння.
**13.20** «Чароўнае дрэва», серыял.
**13.50** Калыханка для самых маленькіх.
**14.15** «Наўцёкі», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**16.05** «Ранча», серыял: 23 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 12 серыя.
**18.00** Дакументальная гадзіна: «Сіла бясcільных», дак. фільм, 2009 г., ЗША.
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце: «Экспедыцыя да паляўнічых на галовы».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Жэлары», маст. фільм, 2003 г., Чэхія–Славакія–Аўстрыя.
**00.15** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Грып».
**00.25** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Віцебск: (8 029) 3084978, Юрый.
Масты: (8 029) 1387994, Дзмітрый.
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей,
(8 029) 178 31 68, Вольга,
(8 029) 625 57 51, Аксана.

## Шаноўныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 625 57 51.**

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Кассир

Пеня ______
Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

РЭАКЦЫЯ




# ЗАХАД У ШОКУ

Алег НОВІКАЎ

**Замежныя палітыкі працягваюць даваць ацэнку падзеям 19 снежня ў Беларусі. Аналізуючы іх, можна заключыць, што так званы real politick — курс на супрацоўніцтва з Мінскам — пахаваны. Аднак альтэрнатыва пакуль не зразумелая.**

Як вядома, Каляды — самы зручны для дыктатараў або антызаходніх палітыкаў час рабіць свае чорныя справы. У гэты перыяд у палітычным жыцці на Захадзе наступае мёртвы сезон. Нават ключавыя асобы едуць на адпачынак у кола сям'і. Там у ценю каляднай ялінкі, смакуючы калядную гуску, яны вяла рэагуюць на інфармацыю званку. Таму дыктатарам у гэты перыяд можна рабіць усё, што душа пажадае.

Так было ў 1979-м, калі СССР адправіў войскі ў Афганістан, у 1981-м, калі душылі польскую «Салідарнасць». Інтуітыўна або мэтанакіравана беларускія ўлады таксама правялі самы буйны ў гісторыі хапун супраць апазіцыі напярэдадні калядных вакацый.

Але на гэты раз «калядны» сцэнар відавочна не спрацаваў. Дастаткова згадаць заяву кіраўнікоў МЗС Польшчы, Швецыі Чэхіі і Германіі. Артыкул з красамоўнай назвай «Лукашэнка прайграў» за іх подпісам з'явіўся 22 снежня ва ўплывовай «Wall Street Journal».

Беларусь у разгар Каляд наведала Марылуізэ Бек, дэпутат Бундэстагу, якая па вяртанню ў ФРГ зрабіла шэраг катэгарычных заяў адносна сітуацыі ў Беларусі. Яе словы «Захад у шоку ад таго, што адбываецца ў Беларусі», сталі крылатымі.

У той жа час прагучала інфармацыя пра стварэнне спісу грамадзян РБ, якім будзе забаронены ўезд у Польшчу праз іх удзел у падаўленні дэмакратычных свабод.

Ужо падчас навагодніх святаў шэраг вядомых польскіх інтэлектуалаў прынялі заяву салідарнасці з беларускай апазіцыяй. Дададзім, што мінскі хапун выпаў на 40-ю гадавіну трагічных падзей у Гданьску ў 1970-м. Шмат хто па той бок Бугу нявольна правёў гістарычныя паралелі паміж падзеямі 1970 і тым, што адбылося на мінскай плошчы Незалежнасці.

У навагоднім звароце да нацыі пра праблемы з дэмакратыяй на Беларусі асобна згадаў польскі прэзідэнт Браніслаў Камароўскі. «Асабліва сардэчныя думкі мы дасылаем беларускім дэмакратам. Выказваем салідарнасць з імі і заклікаем да спынення палітычных рэпрэсій супраць іх», — заявіў прэзідэнт Польшчы.

31 снежня, у апошні дзень мінулага года, нечакана вырашыў павіншаваць Лукашэнку з перамогай украінскі калега. З улікам таго, што раней Віктар Януковіч публічна жадаў АГЛ перамогі на выбарах, запозненае віншаванне выглядае неяк дзіўна. Магчыма, гэта звязана з унутрыпалітычнымі працэсамі ва Украіне. Апошнім часам Януковіча моцна крытыкуюць за аўтарытарны стыль кіравання. Віншаванне на адрас Лукашэнкі ў іншы час відавочна адразу выкарысталі б варожыя да Фёдаравіча СМІ. Аднак паколькі на дварэ было 31 снежня, інтарэс да паслання быў нулявы.

Таксама непаслядоўнай выглядае пазіцыя Масквы. Шмат хто сцвярджае, што менавіта заключаная напярэдадні выбараў расійска-беларуская дамоўленасць пра Адзіную эканамічную прастору (АЭП) стала карт-бланш для Мінску, каб правесці маштабную зачыстку апазіцыйнага поля. З іншага боку, расійскія медыя, профіль аналітычных каментараў якіх вызначае Крэмль, дружна сцвярджаюць, што выбары ў Беларусі былі, мякка кажучы, не вельмі дэмакратычнымі.

Масла ў полымя падлівае дзіўная эпапея з расійскімі грамадзянамі, якія былі затрыманыя 19 снежня. Спачатку ім адмовілі ў вызваленні, нягледзячы на незвычайна рашучыя патрабаванні з боку Масквы. Пасля частку вязняў на незразумелай юрыдычнай падставе раптам выпусцілі. Яўна да апошняга дня зацягнуў з віншаваннем Лукашэнкі і Дзмітрый Мядзведзеў. У выніку ўсё ж павіншаваў. Аднак тэкст віншавання чамусьці на сайце прэзідэнта РФ так і не з'явіўся.

Мітусню ў паводзінах Расіі розныя каментатары тлумачаць па-рознаму. Пачынаючы ад таго, што Масква быццам жадае максімальна падкасіць рэйтынг Лукашэнкі на расійскім палітычным рынку напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі. Заканчваючы тэзісам пра тое, што расіяне спрабуюць захаваць твар, паколькі сваімі дамовамі наконт АЭП яны ў выніку падставілі Някляева. Лідэра кампаніі «Гавары праўду» ўсе чамусьці дружна лічылі прамаскоўскім кандыдатам. Градус прыязні да Масквы сярод беларускай грамадскасці пасля апошніх падзей сапраўды рэзка знізіўся, што, у сваю чару, паніжае шанцы для Масквы на стварэнне ў Беларусі сваёй пятай калоны.

Усе згаданыя версіі слаба аргументаваныя. Аднак у любым выпадку нейкая нервовасць на лініі Масква—Мінск відавочна прысутнічае. 5 гадоў таму, пасля таксама супярэчлівай для Захаду перамогі Лукашэнкі на выбарах, падтрымка расіян была значна больш моцнай і паслядоўнай.

Найбольш трывожны сігнал для Мінску — сумесны заклік МЗС Польшчы і Германіі правесці спецыяльнае пасяджэнне Савета Еўропы па сітуацыі ў Беларусі. Савет Еўропы — другі пасля Еўрапарламента заканадаўчы орган ЕС.

Будучае пасяджэнне яўна не будзе прахадным. Германія — родапачынальнік г.зв. «рэалпалітыкі» — цяпер яўна збіраецца дабівацца рашучых крокаў супраць Мінску. Увесь спектр нямецкіх партый — ад праўладных да пазіцыйных — пры слове Беларусь, што называецца, *«рвет и мечет»*.

«Урад Германіі не будзе мірыцца з парушэннямі, якія былі допушчаны падчас мінулых прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, і мае намер заахвоціць Еўрапейскі Саюз ясна выказацца па гэтай праблеме», — заявіў міністр замежных спраў ФРГ Гіда Вестэрвеле 2 студзеня газеце «Frankfurter Allgemeine». Па словах міністра, Берлін будзе настойваць на тым, каб ЕС даў недвухсэнсоўны адказ на маніпуляцыі і звярнуў увагу беларускіх адказных асобаў на недапушчальнасць падобнай практыкі.

У сваю чаргу, афіцыйны прадстаўнік федэральнага ўрада Штэфан Зайберт падкрэсліў, што ФРГ знаходзіцца на баку тых у Беларусі, хто імкнецца да волі і дэмакратыі. «Гвалт, ужыты Аляксандрам Лукашэнкам супраць апазіцыі, з'яўляецца парушэннем усіх дзяржаўна-праваных асноў», — заявіў Зайберт.

Дадатковым фактарам для крытыкі Мінску стала рашэнне пра закрыццё офісу АБСЕ. Па той бок Бугу усе лічаць, што гэта помста за пазіцыю назіральнікаў ад арганізацыі падчас выбараў, якія адмовіліся прызнаваць іх вынікі.

Так, Клаўдыя Рот, старшыня нямецкіх Зялёных, адзначае, што забарона на дзейнасць бюро АБСЕ ў Мінску «сведчыць пра намер Лукашэнкі ўсімі спосабамі захаваць несправядлівы рэжым і схаваць дапушчаныя парушэнні на выбарах і іх праўдзівы вынік».

Міністр замежных спраў Літвы Аўдронюс Ажубаліс, які стаў дзейным старшынёй АБСЕ, заклікаў урад Беларусі перагледзець сваё рашэнне аб непадаўжэнні мандата офіса АБСЕ ў Мінску.

Здаецца, адзіная краіна, дзе ёсць супярэчнасці ў падыходах да беларускіх рэалій, — гэта Літва. З аднаго боку, экс-прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус назваў замежную палітыку Літвы ў дачыненні да Беларусі катастрофай. «Мы, без сумневу, перастараліся, жадаючы дагадзіць Аляксандру Лукашэнку. Мы проста сталі пасмешышчам», — сказаў Адамкус.

З іншага — прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ сказала, што «катастрофа — гэта тое, што ў адносінах да суседняй краіны і Аляксандра Лукашэнкі, якога завуць «апошнім дыктатарам Еўропы», не выявілі прыязнасці, а замест гэтага на 10 гадоў павярнуліся да яго спінай».

Прынцыпы новай палітыкі краін ЕС адносна Беларусі пакуль, на жаль, абмяжоўваюцца лозунгамі салідарнасці з дэмакратамі. Час надаць новаму падыходу канцэптуальнае вымярэнне і напоўніць іх канкрэтыкай.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Аляксандр Лукашэнка, які пры сумнеўных акалічнасцях у чацвёрты раз абраны прэзідэнтам Беларусі, выправаджвае з краіны Арганізацыю па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. АБСЕ, сябры якой і большасць іншых назіральнікаў асудзілі вынікі выбараў. І вось зараз ёй трэба адпраўляцца дадому. Захад сігналізаваў пра гатоўнасць даць Беларусі мільярдныя крэдыты, Усход у выглядзе Масквы — пра тое, што ўсталюе па-братэрску нізкія кошты на газ. Калі б Лукашэнка не стаў адных сутыкаць ілбамі з іншымі, яго можна было б папракнуць у адсутнасці інстынкту ўлады. А калі дадаць да гэтага апазіцыю, якой не ўдалося прыйсці да згоды і высунуць на выбарах адзінага кандыдата, то яго можна толькі павіншаваць. Апошні дыктатар Еўропы прапануе сваім грамадзянам стабільнасць і сціплы дабрабыт ва ўмовах палітычнай стагнацыі. Еўропе гэтаму пакуль супрацьпаставіць няма чаго.

**«Suddeutsche Zeitung» (Германія)**

Спачатку прэзідэнт Расіі прызнаў беларускія выбары ўнутраным пытаннем Беларусі, а ўжо 25 снежня павіншаваў Аляксандра Лукашэнку. Адначасова з гэтым галоўныя тэлевізійныя каналы Расіі паказалі шэраг рэпартажаў, прысвечаных прэзідэнцкім выбарам, у якіх ставіўся пад сумнеў іх вынік, а таксама гаварылася пра жорсткае стаўленне да апазіцыі і пра масавыя фальсіфікацыі. Падобная крытыка з боку расійскіх СМІ не была б магчымая без санкцыі ўлад. Яна носіць характар запланаванай кампаніі. Гэта азначае, што Масква дасылае Лукашэнку сігнал пра тое, што ён не павінен быць увесь час упэўнены ў расійскай падтрымцы. Падтрымка гэта ўмоўная, і яна залежыць, у тым ліку, і ад выканання абавязацельстваў па стварэнні АЭП.

**Регнум (Расія)**

Беларускі флірт з дэмакратыяй быў павархоўным. Лукашэнка за апошнія два тыдні распачаў наступ, вельмі жорсткі нават паводле яго ўласных стандартаў. І які адказ? Урады застаюцца безудзельнымі. Немцы, прынамсі, запрасілі на размову беларускага пасла ў Берліне. Яны, а таксама палякі, чэхі і шведы, болей за іншых робяць гучныя заявы. ЕС цягам апошняга часу спрабаваў уціхамірыць Лукашэнку прапановай аб гандлёвых кантрактах у абмен на лібералізацыю палітыкі. Гэта магло спрацаваць, але не спрацавала.

**«The Independent» (Вялікабрытанія)**

Забарона ўезду ў нашу краіну, а ў перспектыве, магчыма, і ва ўсе краіны Шэнгенскай зоны, у гэты раз будзе распаўсюджвацца на значна большую групу беларускіх службоўцаў. А той факт, што гэты спіс застанецца адкрытым, можа адхіліць беларускіх пракурораў ці высокіх функцыянераў спецслужбаў ад далейшага пераследу апазіцыі. Такім чынам, Польшча падае Лукашэнка і яго зграі выразны знак: акцыі па пераследу апазіцыянераў не застануцца на Захадзе без водгуку. Будзе яшчэ лепш, калі ў Польшчы атрымаецца сфармаваць агульнаеўрапейскі, а можа нават сусветны блок падтрымкі беларускай апазіцыі. Раней міністр Сікорскі і яго нямецкі калега пераконвалі Лукашэнку адкрыцца ў бок Еўропы. Гульня з дыктатарам не мела вынікаў. Аднак варта было рызыкнуць і нават абпаліцца, каб у будучыні дзейнічаць эфектыўна.

**«Polska» (Польшча)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. НАЗВУ «КРЫМ» ЗАБАРОНЯЦЬ?

Лідар крымскай казацкай абшчыны «Собаль» Віталь Храмаў патрабаваў знішчэння татарскай тапанімікі, да якой належыць і слова «Крым». На яго думку, паўвостраў павінен называцца Таўрыя. Печанегі (так ён называе крымскіх татараў) — гэта прышлая этнічная група, якая з'явілася ў Таўрыі 750 гадоў таму, на 500 гадоў пазней, чым рускія, на 800 гадоў пазней германскіх плямёнаў готаў і булгар, на 1000–1200 гадоў пазней за армян і габрэяў, на 2000 гадоў — за грэкаў. Рускія з'яўляюцца «карэнным народам, а печанегі — ворагі рускай дзяржавы. Украіна для іх важная, каб яна стала Дзікім полем любым коштам». Па словах казака, менавіта таму трэба вярнуць Крыму назву Таўрыя — «імя зямлі, дзе была хрышчоная Русь, калі паўвостраў быў цэнтрам не гандлю рабамі, а земляробства і гандлю мясамі, пянькой і збожжам». Пакуль што грамадства ніяк не рэагуе на заклікі да змены назву паўвострава.



По матэрыялах украінскай прэсы

### УЗБЕКІСТАН. СКРАЛІ НАВАГОДНІЯ ДЗІЦЯЧЫЯ СВЯТЫ

У канцы снежня 2010 года ва ўсіх дзіцячых садках Узбекістана патрапілі пад забарону дзіцячыя навагоднія святы і канцэрты. Па словах загадчыкаў дашкольных установаў, неафіцыйнае распараджэнне, якое забараняе імпрэзы напярэдадні Новага года, паступіла непасрэдна з Міністэрства дашкольнай адукацыі (ёсць і такое!). Бацькам «катэгарычна забараняецца» збіраць грошы на падарункі да навагодніх ранішнікаў. Таксама забаронена ставіць у актавых залах упрыгожаныя цацкамі і гірляндамі жывыя і штучныя елкі. У дварах садоў — калі ласка, але не ў зачыненых памяшканнях. Аднак шматлікія кіраўнікі ташкенцкіх садкоў па патрабаванні выхавальнікаў, на свой страх і рызыку, усё ж вырашыліся арганізаваць святы з удзелам Дзеда Марозаў. Але… без бацькоў. Мабыць, каб яны не разнеслі па горадзе гісторыі пра гэтыя «злачынствы». Па асноўнай версіі, забарона прыдумана, каб знішчыць канкурэнтаў так званай «прэзідэнцкай ялінкі». Цікава, што адначасова ў навагодніх спектаклях забароненыя персанажы рускіх народных казак: Баба Яга, Кашчэй і іншыя. Рэжысёрам пастановак было рэкамендавана ўводзіць толькі герояў узбекскіх казак. Гэта сакрэтная забарона не кранула толькі Дзеда Марозу і Снягуркі.


Хурматли ота-оналар !
Янги йил байрами совғаларига ва турли хил арча тадбирларига ноқонуний пул йиғиш қатъий ман этилади .
Маъмурият .
Уважаемые родители !
Категорически запрещается собирать деньги на подарки к Новогодним утренникам .
Администрация

Па матэрыялах Фергана.Ру

### ВЕНГРЫЯ. СУПРАЦЬ БУДАПЕШТУ ТАКСАМА ЎВОДЗЯЦЬ САНКЦЫІ

У першы дзень студзеня 2011 года эстафета старшынства ў ЕС павінна была перайсці да Венгрыі. Аднак на Каляды партнёры нечакана прыстрашылі гэтай краіне адхіленнем ад шасцімесячнай місіі. Каменем стаў новы закон пра СМІ, зацверджаны парламентам. Ён яшчэ не падпісаны прэзідэнтам, а ўжо выклікаў рэзананс у ЕС. Па меркаванні крытыкаў, закон дазволіць істотна ўзмацніць кантроль над прэсай. Калі тэкст набудзе моц, у Будапешце з'явіцца новае ведамства па справах СМІ (NMHH). Пад яго кантроль патрапяць не толькі дзяржаўныя, але і прыватныя тэле- і радыёстанцыі, а таксама газеты і інтэрнэт-парталы. Ведамства атрымае права накладаць на іх буйныя штрафы і абавязваць журналістаў у шэрагу выпадкаў раскрываць свае крыніцы інфармацыі. Лідар фракцыі сацыял-дэмакратаў у Еўрапарламенце Марцін Шульц мяркуе, што Венгрыя не вартая быць старшынёй ЕС. Ён нават заклікаў прымяніць да Будапешту эканамічныя санкцыі, лічачы іх больш дзейснымі. А люксембургскі дырэктар МЗС Жан Ассельборн заявіў, што калі ўрад Венгрыі будзе трымацца свайго плану, тое паўстане пытанне, наколькі гэта краіна «годная» ўзначаліць ЕС. Пакуль Будапешт маўчыць.

Па матэрыялах нямецкай прэсы

ЦІКАВА

# САВА СУПРАЦЬ КАМЕНЯ

*Алег НОВІКАЎ*

**Сапраўдны навагодні сувенір зрабіў суайчыннікам казахскі прэзідэнт Нурсултан Назарбаеў. Літаральна напярэдадні Новага года ў краіне пачаўся збор подпісаў за правядзення рэферэндуму пра падаўжэнне тэрміну яго паўнамоцтваў аж да 2020 года.**



Фармальна бачыць НАНа або Нура (мянушкі Назарбаева) на пасадзе гаранта канстытуцыі яшчэ дзесяць гадоў, прычым без усякіх там выбараў, пажадалі 900 простых грамадзян, якія 23 снежня ўзялі і чамусьці сабраліся ва Усць-Каменагорску.

Аднак ніхто ў краіне не мае ілюзій наконт таго, што адміністрацыя прэзідэнта не ведала пра іх сход і праекты рэзалюцый. Інакш бы ініцыятыўная група па правядзенню плебісцыту не была зарэгістраваная так хутка — ужо 27 снежня. Інакш бы яшчэ да пачатку рэгістрацыі той жа групы ў шматлікіх рэгіёнах вертыкаль не пачала чыніць адміністратыўны ціск на бюджэтнікаў, патрабуючы ад іх «адабрамсу» прапановы пра рэферэндум. Інакш бы адказныя на месцах за збор подпісаў не атрымлівалі б грошы з нейкага фонду ініцыятараў кампаніі.

Казахская служба «Радыё Свабода» цытуе чыноўніка, які кажа, што ім пастаўлена задача сабраць патрэбную колькасць (200 тысяч) подпісаў да 10 студзеня. Калі такую колькасць збяруць, прэзідэнт мае права прызначаць або не прызначаць рэферэндум.

Пра тое, якое рашэнне хутчэй за ўсё прыме НАН, наглядна кажа тэкст рэзалюцыі, што аператыўна ўжо паспелі прыняць дэпутаты парламента (яны, дарэчы, усе як адзін — сябры прэзідэнцкай партыі «Нур Атан»).

«Усведамляючы гістарычную ролю і місію першага прэзідэнта Рэспублікі Казахстан — лідэра нацыі Нурсултана Абішэвіча Назарбаева як заснавальніка незалежнай дзяржавы, падтрымліваем прапанову пра правядзенне рэспубліканскага рэферэндума па падаўжэнні яго прэзідэнцкіх паўнамоцтваў да 2020 года», — гаворыцца ў паведамленні, распаўсюджаным 27 снежня прэс-службай казахскага парламента.

Ідэя з рэферэндумам стала сапраўдным шокам як мінімум для казахскага палітыкуму. І не толькі апазіцыйнага. Толькі ў верасні палітычны дарадчык прэзідэнта Ертысбаеў заявіў наступнае: «Выбары будуць, таму што ніхто не можа ігнараваць канстытуцыю. Ніякага рэферэндуму пра падаўжэнне паўнамоцтваў не будзе. Гэта ўсё чуткі».

У дадатак лічылася, што, кіруючы АБСЕ, Назарбаеў устрымаецца ад такога відавочна супярэчлівага ў вачах Захаду кроку, як правядзенне рэферэндуму.

Нарэшце, ёсць юрыдычныя праблемы. Хаця пастаноўка такога пытання на рэферэндум, па закону, магчыма, яна ўскосна супярэчыць пункту канстытуцыі, які прадугледжвае «зменнасць улады».

Неабходнасць рэферэндуму матывуюць перш за ўсё эканамічнымі фактарамі. Быццам дзякуючы яму можна будзе эканоміць масу грошай, якія б пайшлі на арганізацыю дарагіх прэзідэнцкіх выбараў. Гэтая фармулёўка стварае прававы абсурд. Калі эканомія на першым месцы, то лагічна было б таксама адмяніць наступныя выбары ў парламент, працягнуўшы тэрмін яго кадэнцыі на 10 гадоў. Тое ж самае тычыцца даты абрання дэпутацкага корпусу мясцовых саветаў.

Аднак усе гэтыя аргументы афіцыйнай Астане да аднаго вядомага месца. Большасць грамадства нейтральна ставіцца да таго, што робіцца наверсе.

Агульную сітуацыю ў Казахстане слушна апісаў адзін блогер: «Казахі кажуць: «Стукні саву каменем — сава пампэ, стукні камень савой — сава пампэ». Становішча ў нашым народзе сёння менавіта такое. У нас сёння ёсць прэзідэнт Назарбаеў. У яго няма жадання сыходзіць са свайго месца. Але і сілы супраць яго няма».

Сапраўды, у параўнанні з суседзямі — Узбекістанам або Туркменіяй — люфт свабоды ў Казахстане значна большы: ёсць легальныя апазіцыйныя партыі і СМІ. А на казахскіх форумах можна часта прычытаць запісы кшталту: «Хочаш рэвалюцыю, якая яна не была б — ружовая, жоўтая ці рознакаляровая, — тады едзь у Кіргізію. Вось там ты ўбачыш тое, што тут яшчэ не сустракаў. Поўная галеча і нацыяналізм».

Прысутнічае страх за суверэнітэт. «Некаторыя казахі відавочна жадаюць незалежнасць страціць, арганізаваўшы выбары без Назарбаева, якому ўдалося захаваць, хай пакуль няспелае, але адзінства і незалежнасць. Спадзяюся, што праз 10 гадоў адзінства ў народзе будзе дастаткова, каб захаваць незалежнасць краіны», — можна прачытаць на адным з казахскіх патрыятычных сайтаў.

У такіх умовах, як піша адно мясцовае выданне: «Апазіцыйным партыям зараз застаецца выконваць ролю статыстаў. Наглядаць за фарсіраванымі тэмпамі новай кампаніі і фіксаваць шматлікія факты злоўжывання адміністрацыйным рэсурсам, ціскам на выбаршчыкаў».

Задачы апазіцыянерамі ставяцца самыя мінімальныя. Так, Маржан Аспіяндзірава, адзін з лідараў апазіцыйнай партыі сацыял-дэмакратаў, наступным чынам тлумачыць палітычны момант: «Калі ў гэтай краіне знойдзецца хаця б адзін педагагічны калектыў, які разам з дырэктарам адмовіцца займацца гэтай ганебнай справай (збіраць подпісы за рэферэндум), тады сапраўды для нашай краіны яшчэ не ўсё страчана».

Адзіная надзея дысідэнтаў на тое, што ў Назарбаева раптам абудзіцца сумленне. Аднапартыец згаданай Маржан заявіў: «Цяпер мы спадзяемся на тое, раптам заўтра прэзідэнт скажа: «Дзякуй, хлопцы, за вашу ініцыятыву, але я павінен ісці на выбары. Я буду працаваць столькі, колькі дазручыць мне гэта наш народ».

Яшчэ адзін іх козыр — маральны шантаж улады. Па словах апазіцыянераў, ідэя з рэферэндумам падштурхне блізкія да ўлады кланы пайсці ў апазіцыю.

«Ствараецца прэцэдэнт, рызыкі ў выглядзе магчымага супраціву з боку алігархічных уладных групавак, якія спадзяюцца хуткім часам сесці на гэта (назарбаеўскае) крэсла. Яны таксама губляюць надзею, а гэта можа прывесці да розных эксцэсаў» (Жармахан Туякбай).

Самае цікавае, што на фоне палітычнай пасіўнасці масаў ідэя з рэферэндумам, мяркуючы па тых жа форумах, усё ж выклікала ў народзе насцярогу. Баяцца таго, што прэзідэнт, якому ўжо за 70 гадоў, так дасюль і не сфармуляваў механізм перадачы ўлады. Што будзе праз 10 гадоў, калі яму будзе ўжо 80? Ці можа чалавек у такім ўзросце цвяроза аналізаваць стан рэчаў? А што будзе пасля, увогуле цяжка прагназаваць…

У гэтым сэнсе варта працытаваць яшчэ аднаго казахскага блогера: «Час на пастаменце помніка незалежнасці ў Алма-Аты паставіць статую барана ў перадсмяротным чаканні замест цяперашняй статуі барса, які скача. Гэта будзе дакладным адлюстраваннем палітычнай сітуацыі ў Казахстане».

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

# ЗЛАЧЫНСТВА, ЯКОЕ АБУДЗІЛА НАЦЫЮ

Алег НОВІКАЎ

**50 гадоў таму шатландцы нечакана зразумелі, што яны не англічане. Усё з-за групы студэнтаў-нацыяналістаў, якая выкрала з Вестмінстэрскага абацтва Скунскі камень — сімвал незалежнасці Шатландыі.**


У Эдынбургскім замку захоўваецца Скунскі камень

Тэма містычных якасцяў асобных камянёў — не манаполія шатландцаў. Так, у старажытных славенцаў кожны кандыдат на пасаду князя праходзіў спецыяльны рытуал — павінен быў стаць на камень з мячом. Пазней з каменя зрабілі трон для мясцовага герцага. Калі Славенія стала незалежнай, менавіта выяву каменя змясцілі на першых банкнотах маладой краіны. Зараз той камень можна пабачыць на манетах наміналам два еўрацэнта.

Быў такі сакральны камень і ў шатландцаў. Ён называўся An Liath Fai, што можна перавесці як «камень лёсу». Ён важыць 152 кілаграмы. Першапачаткова камень знаходзіўся ў абацтве Скуна (яго іншая назва — Скунскі камень). Існуе шмат легенд, адкуль ён узяўся ў Шатландыі. Самая экзатычная сцвярджае, што камень прывезлі сюды егіпцяне. Манахі абацтва казалі, што менавіта на гэтым камні спаў біблейскі Якаў, калі пабачыў у сне лесвіцу ў нябёсы. Гісторыкі лічаць, што камень выкарыстоўваўся старадаўнімі кельтамі, якія прыбылі сюды з Ірландыі.

У любым выпадку, на працягу стагоддзяў на An Liath Fai каранаваліся манархі Шатландыі. Падчас абраду каранацыі яны сядзелі на камні.

У 1296 годзе, падчас адной з войнаў паміж Англіяй і Шатландыяй, англійскі кароль Эдуард Даўганосы захапіў камень як вайсковы трафей. Рэліквію прывезлі ў Вестмінстэр і паклалі пад трон, на якім традыцыйна каранаваліся англійскія каралі.

У 1328 годзе Шатландыя і Англія дамовіліся пра тое, што камень вернецца на радзіму. Але Лондан дамовы не выканаў. З часам шатландцы забылі і пра пункт той дамовы, і пра камень, і нават пра незалежнасць (пасля вайны нацыяналісты Шатландыі збіралі на выбарах не больш за 0,7 працэнтаў).

Аднак не ўсе шатландцы сталі англічанамі. Яшчэ з 1920-х гадах у краі існавала Студэнцкая асацыяцыя шатландскіх нацыяналістаў (GUSNA). Яе сябры часта ламалі галаву, якім чынам абудзіць у суайчыннікаў інтарэс да сваёй культуры і гісторыі? Неяк група студэнтаў, лідарам якіх быў навучэнец юрфаку Ян Гамільтан, падумала: а што калі скрасці Скунскі камень.

Раніцай 14 снежня 1950 года яны прабраліся ў каранацыйны зал Вестмінстэрскага абацтва і забралі адтуль сімвал сваёй незалежнасці. У ходзе аперацыі камень разламаўся (ёсць версія, што ён быў і так даўно расколаты). Па частках скрадзенае перапраўвілі ў Шатландыю, дзе майстар склеіў яго. Пасля камень схавалі ў зламаным трактары і сталі назіраць за тым, што будзе далей.


Крэсла Святога Эдуарда

Выкраданне каменя лёсу сапраўды нарабіла шуму. Англійская арыстакратыя была раз'юшаная. Кабінет патрабаваў ад Скотланд Ярда тэрмінова знайсці злодзеяў. Пошукі паліцыі не мелі вынікаў. Аднак самі нацыяналісты не былі ў эйфарыі. Жаданага эфекту — выбуху нацыяналістычных настрояў — не адбылося. Шатландцы сапраўды з-за скандалу нечакана прызналі, што яны асобны ад англічан народ. Аднак сам факт злачынства ў імя нацыі яны разглядалі як хуліганства, дыскрэдытацыю сябе як народу.

У красавіку 1951-га студэнты праінфармавалі паліцыю, дзе схаваны камень. Ён вярнуўся ў Лондан. Ужо ў 1953 годзе на ім каранавалася Елізавета Другая. Раней супраць Гамільтана завялі справу, ходу якой, аднак, не далі. Відавочна, учынак Гамільтана і самую ідэю шатландскай незалежнасці тады ўспрымалі за дзіцячае хуліганства.

Сам Гамільтан, дарэчы, сапраўды нагадваў палітычнага хулігана. Пасля ўніверсітэта, працуючы як юрыст, ён праславіўся тым, што падчас судовых працэсаў называў Елізавету Другую Елізаветай Першай. Аргументацыя ў яго была наступная: Елізавета Першая не была каралевай Шатландыі, якая тады яшчэ была незалежнай дзяржавай. Таму для шатландцаў цяперашняя каралева Елізавета Другая ёсць Елізавета Першая.

Аднак з часам сітуацыя і стаўленне да ўчынку Гамільтана пачалі мяняцца. У 1960-я партыя шатландскіх нацыяналістаў упершыню атрымала мандат у парламенце. У 1970-я яна стала другой па папулярнасці мясцовай партыяй. Грамадства пераглядзела стаўленне да выхадкі студэнтаў. Яны сталі героямі нацыі. Пункт пра неабходнасць вяртання Скунскага каменя на радзіму ўключылі ў партыйную праграму Шатландскай нацыянальнай партыі (SNP).

У 2008 годзе пра выкраданне каменя лёсу нават знялі мастацкі фільм «Stone Of Destiny». Ролю Гамільта сыграў Чарлі Кокс.

Яшчэ раней камень лёсу вярнуўся ў Шатландыю.

У 1996 годзе ўрад лейбарыстаў пагадзіўся перадаць камень лёсу ў Эдынбург. У тэксце пагаднення ёсць, аднак, такі пункт: на час каранацый брытанскіх манархаў камень будуць браць у арэнду. 30 лістапада ў Дзень Святога Андрэя (нябесны патрон Шатландыі) камень даставілі ў Эдынбургскі замак. За цырымоніяй вяртання сімвала незалежнасці назірала каля 10 тысяч чалавек. Далі слова і Гамільтану.

Сам Гамільтан, якому стукнула 85 гадоў, дасюль не лічыць сябе героем. «Я не палітычная фігура. Я проста веру ў маю краіну. Мне было крыўдна, калі казалі, што няма ніякай Шатландыі. Я папросту хацеў абудзіць шатландцаў».

Праўда, ёсць версія, што Скунскі камень, які ляжыць у замку ў Эдынбургу, несапраўдны. Быццам у 1951 годзе студэнты наўмысна перадалі паліцыі фальшыўку. Аднак гэта далёка не першая байка. Паводле іншых, больш ранніх версій, сапраўдны камень лёсу хаваецца ў Шатландыі. Старажытныя манахі не дазволілі англійскім акупантам звесці сімвал нацыі і падсунулі ім падробку. Арыгінал быццам закапаны пад адным з пагоркаў або ляжыць на дне ракі Тэй. Распавядаюць таксама, што артэфакт перадалі рыцарам з ордэну тампліераў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### АЛЯКСАНДР ЛУК'ЯНЧАНКА

Мэр Данецку заявіў, што прынцыпова не будзе размаўляць па-ўкраінску. «У нас моўнае пытанне мала каго хвалюе: як размаўляе чалавек, так яго і ўспрымаюць. Калі ў мяне пытаюцца, чаму я не валодаю дзяржаўнай мовай, я кажу, што я размаўляю на мове маіх выбарцаў… Вось пайсці сёння ў калектыў Данецкага металургічнага завода ці на шахту, выйсці і зрабіць даклад на ўкраінскай мове — яны паслухаюць, а потым будуць думаць, што ў мэра здарылася нешта з галавой», — распавёў кіраўнік горада. Разам з тым Лук'янчэнка адзначыў, што ў Данецку няма праблем з выкарыстаннем украінскай мовы. «У Данецку жывуць у згодзе і паразуменні 113 нацыянальнасцяў. Калі мы праводзілі апытанне, дык апынулася, што 89% гараджан размаўляюць па-руску, і ніякай напружанасці няма. Хто жадае размаўляць па-ўкраінску, тыя гавораць па-ўкраінску», — сказаў гарадскі галава. Цікава, што большасць каментараў палічылі заяву Лук'янчанка правакацыяй. «Так, сапраўды, у мэра праблема з галавой», — напісаў нехта.



### ІРАКЛІЙ АЛАСАНІЯ

Лідэр апазіцыйнага руху «Альянсу за Грузію» і яго паплечнікі выступілі супраць перайменавання вуліц Тбілісі ў гонар амерыканскіх палітычных дзеячаў. Пратэст звязаны з намерам уладаў назваць адну са старых вуліц горада ў гонар дыпламата Рычарда Холбрука, які нядаўна памёр. «Лічым, што гэта з'яўляецца не часткай грузіна-амерыканскага партнёрства, а працягам савецкіх традыцый, калі ў Тбілісі было мноства вуліц у гонар сакратароў ЦК і рэвалюцыянераў… перайменаванне вуліц у гонар амерыканскіх палітычных дзеячаў з'яўляецца праявай рэцыдыву каланіялізму», — гаворыцца ў заяве. Іншая ідэя грузінскіх улад пакуль застаецца без рэакцыі грамадскасці. Гаворка ідзе пра прапанову шэрагу дэпутатаў абавязаць усе рэстараны і забаўляльныя ўстановы краіны ўнесці ў меню запіс пра тое, што 20 працэнтаў тэрыторыі Грузіі акупавана.

### БАРЫС НЯМЦОЎ

Адзін з лідараў расійскай ліберальнай апазіцыі і два яго паплечніка сталі вязнямі сумлення. Адпаведнае рашэнне прыняла арганізацыя Amnesty Internacional. За краты Барыс і яго сябры трапілі літаральна пад бой курантаў. У міліцыю дэмакратаў даставілі 31 снежня пасля мітынгу на Трыўмфальнай плошчы ў падтрымку 31-га артыкула Канстытуцыі РФ пра свабоду сходаў. Ужо ў новым годзе суд вынес яму пакаранне ў выглядзе 15 сутак арышту за супраціўленне міліцыі. Арышт Нямцова абурыў дэмакратычную Маскву. З ідэяй мастацкай акцыі па слядах суда над Барысам Нямцовым выступіў вядомы тэатральны рэжысёр Міхась Үгараў. У сваім блогу ў «жывым часопісе» ён нагадвае пра тое, што падчас пасяджэння суддзя 5 гадзін не давала Нямцову магчымасці прысесці, сцвярджаючы, што ў судзе няма вольных крэслаў. Міхась Үгараў у гэтай сувязі прапануе сабраць па ўсёй Маскве старыя крэслы і прынесці іх да Цвярскога суда. Як піша рэжысёр, «няхай людзі, якія пераступаюць закон, іх разграбаюць». Пры ўсім творчым падыходзе, аднак, акцыя пратэсту каля суду, які вынес прысуд Нямцову, не сабрала больш за 50 чалавек. Гэта выклікала шмат песімістычных роздумаў у інтэрнэце наконт магчымасці грамадзянскай супольнасці ў Расіі. Цікава, што сярод каментараў сустракаюцца і наступныя: «Шкада, што мы жывём не ў Беларусі. Вось там кампанія грамадзянскай салідарнасці сапраўды нешта значыць. Трэба кідаць гэтую Расію і ехаць жыць у Мінск».



ШМАТПАКУТНЫЯ

# КРЫЖЫ ЮРКІ МОНІЧА

Таццяна УЛАСЕНКА

**Калі будзе магчымасць зняць мастацкі фільм у хічкокаўскім стылі ці дэтэктыўны серыял у стылі Яна Флемінга, заснаваны на рэальных падзеях, то галоўным героем абавязкова павінен быць Юрка Моніч. Сялянскі сын, народны настаўнік, герой першай сусветнай вайны, начальнік штаба палка Слуцкага Збройнага Чына, камандзір партызанскага атрада. Гэта каларытнейшая асоба свайго часу сярод іншых беларускіх змагароў. Толькі ўявіце — годнае, поўнае прыгодаў жыццё, а ў дадатак — гераічная і трагічная, нібы для кіношнага сцэнарыя прапісаная, смерць.**



Твор мастака Алеся Пушкіна з серыі «Беларускі Рэзыстанс»




Крыж, замацаваны на дрэве, — у памяць аб крыжах на елках




Партрэт Моніча, напісаны А. Пушкіным, а побач пералічаныя прозвішчы ўсіх забітых і зніклых аднавяскоўцаў



Гэты шматпакутны крыж, устаноўлены на Барысаўскіх батарэях, прастаяў толькі пяць дзён

За некалькі гадзін да скончэння жыцця беларускі герой трапіў у аблаву бальшавікоў. Знаходзячыся ў двайным коле ўзброеных салдат, ён усё ж змог праравць адно ачапленне і вырвацца. І толькі другое кола чэкістаў спыніла Моніча. Бальшавікі ўвагналі ў цела камандзіра 9 куль, доўга збівалі труп прыкладамі вінтовак, здзекаваліся з яго, потым павезлі па навакольных мястэчках Барысаўскага павета паказваць сялянам, каб тыя пабачылі, што можа здарыцца з кожным, хто не зміраецца. У знявечаных, акрываўленых рэштках цела з цяжкасцю можна было пазнаць ліхога камандзіра. І забойства яго, здзейсненае 23 мая 1924 года, стала трагічнай падзеяй для сялянства і для ўсяго партызанскага антыбальшавіцкага руху.

Варта нагадаць, што ўжо ў 1918 годзе жыхары беларускай вёскі добра зведалі савецкую ўладу, якая вызначылася нечалавечымі метадамі кіравання. Ленінская ўлада душыла сялян харчразвёрсткай, выплочваючы Германіі кантрыбуцыю. Забіралі апошняе. Пакідалі пасля сябе абрабаваныя вёскі, разораныя цэрквы, забітых мірных жыхароў. На беларускім гарызонце замаячыў голад. Не дзіўна, што ў гэты час па ўсёй Беларусі пракаціліся антыбальшавіцкія сялянскія паўстанні, фарміраваліся атрады самаабароны. Адзін з такіх атрадаў, які ўзяў пад кантроль некалькі валасцей Барысаўскага павета, праславіў вопытны камандзір Юрка Моніч. Бальшавікі называлі яго бандытам. Але навакольнае сялянства вітала і паважала смелага кіраўніка ўзброенага атраду, ставілася да монічаўцаў як да сваіх заступнікаў, бо яны баранілі вёскі ад бальшавіцкіх прадатрадаў, забіралі ў іх нарабаванае дабро, харч і зноў вярталі сялянам.

Прыгадваючы асобу Юркі Моніча, распавядаюць цікавую гісторыю, якая здарылася ў 1923 годзе. Атрад монічаўцаў спыніў цягнік «Берлін—Масква». Камандзір атраду на вачах у замежных дыпламатаў загадаў адшомпаліць па цікаваму месцу ўсіх камуністаў, якія ехалі ў цягніку, — па разу за кожны год жыцця «дарагога» Уладзіміра Ільіча. Камуністы змірыліся, бо былі папярэджаны, што пры супраціўленні атрымаюць па разу яшчэ і за кожны год жыцця не менш «дарагога» Карла Маркса. Гэта гісторыя выклікала істэрыку ў Маскве, адкуль быў кінуты спецаддзел ГПУ для знішчэння Моніча і яго паплечнікаў. Дасталі камандзіра толькі праз год.

«У звязку з гэтай гісторыяй мушу дадаць, што ніводзін пасажыр цягніка не быў забіты, — гаворыць мастак Алесь Пушкін. — Але беларусы мусяць шанаваць Моніча не з-за гэтай яскравай гісторыі. Зараз дакладна вядома, што монічаўцы ратавалі беларускіх сялян, вярталі ім нарабаваныя бальшавікамі дабро і харч. Моніч быў нашым беларускім Робін Гудам. І я стаўлюся да яго, у першую чаргу, як да нацыянальнага героя, які ў тагачасных умовах шчыра верыў і аддана змагаўся за незалежнасць Беларусі. Увогуле, мала які раён можа ганарыцца тым, што на яго тэрыторыі змагаліся менавіта за дзяржаву, якая б была без панскай Польшчы і без бальшавіцкай Расіі, за Беларускую Народную Рэспубліку. Афіцыйнае выданне «Звязда» пісала пра гэта яшчэ ў 1924 годзе».

Алесь Пушкін жыве ў вёсцы Бобр — у адной з тых мясцінаў, у якой дзейнічаў атрад монічаўцаў. Беларускаму камандзіру прысвечаны не толькі партрэт. Алесь карпатліва сочыць за тым, каб памяць пра Юрку Моніча была належным чынам ушанавана. Па яго ініцыятыве разам з іншымі прадстаўнікамі беларускай грамадскасці ставяцца крыжы памяці.

Першы крыж Монічу усталёўваўся разам са старшынёй секцыі «Мемарыял» Вячаславам Сіўчыкам 23 мая 2007 года на ўскрайку лесу паміж вёскамі Вялікія Жаберычы і Радзіца. І сёння гэтае месца ў народзе называюць «Монічавым лесам». Крыж замацаваны на дрэве — у памяць пра крыжы на елках, якія пакідалі людзі на тым месцы, дзе быў забіты камандзір.

Яшчэ адзін крыж устаноўлены на Барысаўскіх батарэях з ініцыятывы актывістаў секцыі «Мемарыял» і дэмакратычнай часткі грамадства з Барысава, Крупак, Вілейкі 23 мая 2008 года. «Гэта месца было выбрана невыпадкова, — кажа Алесь. — На барысаўскіх батарэях былі расстраляны ўдзельнікі барысаўскага галоднага бунту, сярод якіх у большасці былі жанчыны і дзеці. Тут былі расстраляны і ўдзельнікі антыбальшавіцкага атрада — аднадумцы Моніча. Па вялікай верагоднасці, тут пахаваны і сам кіраўнік атрада. Крыж прастаяў толькі пяць дзён, а затым быў знесены работнікамі камунальнай гаспадаркі Барысава».

Краязнаўца Андрэй Аляхновіч нагадаў пра два самыя старыя крыжы Монічу, якія захаваліся і па сённяшні дзень. Менавіта з іх трэба было б і пачаць.

«Самы першы крыж з'явіўся на тым самым месцы, дзе быў забіты Моніч. Крыж насыпала жоўтым пясочкам каханая камандзіра з вёскі Вялікія Жаберычы, — распавёў Аляхновіч. — Усё сваё жыццё жанчына даглядала гэтае месца. Цягам часу насыпны крыж пераўтварыўся ў «магілу», якая знаходзіцца ў лесе паміж вёскамі Вялікія Жаберычы і Радзіца. Гэтая мясціна так і завецца — «магіла Моніча». Другі крыж з'явіўся ў 1970-х, пасля смерці жанчыны. Аднак на гэтым месцы наўмысна зрабілі дзялянку — зруйнавалі «магілу» і выпілавалі кавалак лесу, бо на некаторых елках былі выразаныя нажом невялікія крыжыкі ў памяць Моніча. Але праз некалькі гадоў, у 1980-х, на дзялянцы з'явіўся чатырохкутны каменны крыж, выкладзены кімсьці з мясцовага насельніцтва».

23 мая 2009 года на могілках вёсак Вялікія і Малыя Жаберычы, зноў жа па ініцыятыве Алеся Пушкіна, старшыні і актывістаў секцыі «Мемарыял», дэмакратычнай часткі грамадства Крупак, Барысава і Жодзіна быў усталяваны трохметровы драўляны крыж святой Ефрасінні Полацкай. Праз тры дні ён быў ліквідаваны мясцовымі вертыкальшчыкамі па тэлефонным загадзе аблвыканкама. Крыж прызначаўся ўшанаваць памяць не толькі славутага героя, але і ўсіх 55-ці палітычна рэпрэсаваных з гэтай вёскі ў 1924–1944 гадах. Кампазіцыйна тут быў змешчаны партрэт Моніча, напісаны Пушкіным, а побач пералічаны прозвішчы ўсіх забітых і зніклых аднавяскоўцаў.

Чаму зносяць крыжы, хто іх баіцца? «Пакуль жывуць нашчадкі людзей, датычных да забойстваў нацыянальных герояў Беларусі і ўсіх мірных жыхароў (а гэта сыны, унукі, праўнукі), існуе негалосная патрэба засакрэчваць факты і месцы іх злачынстваў. Тэма камуністычных рэпрэсій яшчэ вельмі жывая, трапяткая, балючая. Да прыкладу, у суседняй Украіне праблемы халакосту і галадамору афіцыйна набылі палітычны статус. Беларуская ж дзяржава пакуль не гатова ў поўнай меры прызнаць і асудзіць усе жахі камуністычных вычварэнстваў», — лічыць Алесь Пушкін.

Асудзіць — не значыць не даравць, але мець магчымасць не быць збітым, затрыманым, кінутым у СІЗА, аштрафаваным пры ўскладанні кветак і памінальнай малітве ля мемарыяльнага знака. Таму мушу не пагадзіцца з думкай Алеся Пушкіна. Ушанаванне продкаў, усталёўка крыжоў на месцы страшных расправаў над людзьмі, запальванне знічак і ўскладанне кветак ніяк не суадносяцца з варожасцю і помстай да таго ўнука, дзед ці бацька якога расстрэльваў беларускіх грамадзян. Але ж варожасць і нецярпімасць дэманструецца ўвесь час толькі з аднаго боку. Напрыклад, крыж, усталяваны на Барысаўскіх батарэях ахвярам 1919–1937 гадоў, за апошнія дзесяцігоддзе 10 разоў зносіўся вандаламі і кожны раз аднаўляўся грамадскімі актывістамі. Гэта мемарыяльны помнік расстраляным жыхарам Барысава і мястэчак, у тым ліку, удзельнікам Барысаўскага бунту (прызыўнікам 1919 года) і Барысаўскага галоднага бунту 1932 года. А вандалізмам займаюцца барысаўскія камунальшчыкі — па загаду мясцовых уладаў.

КНІГАРНЯ

# «О, МАТУЛЯ, СТАРОНКА МАЯ!»

Лявон ЦЕЛЕШ

**Беларускі чытач мала ведае пра Алеся Салаўя: творы гэтага выдатнага беларускага паэта ніколі не друкаваліся ў Беларусі. І вось першая кніга, прысвечаная жыццёваму шляху і творчасці паэта, пад назвай «Алесь Салавей» — падарунак беларускім чытачам ад выдавецтва «Лімарыус» (серыя «Галасы Айчыны»).**



Анатоль Крывенка (1942, Мінск)



Мікола Аўрамчык падчас прэзентацыі кнігі

## Балотны агонь

Кніга вызначаецца высокім навуковым узроўнем, а ўкладальнікам яе, аўтарам прадмовы і каментара з'яўляецца беларускі паэт, эсэіст, перакладчык Міхась Скобла. Тыраж кнігі «Алесь Салавей» невялікі, усяго 400 асобнікаў.

На яе амаль 260-ці старонках надрукаваны вершы, паэмы, драматычныя творы паэта, на астатніх 220-ці старонках змешчаны лісты Алеся Салаўя, адрасаваныя паэтам-эмігрантам Ларысе Геніюш, Рыгору Крушыну, Масею Сяднёву, Вітаўту Тумашу, Антону Адамовічу, а таксама ўспаміны сучаснікаў пра Алеся Салаўя. Кніга выйшла ў цвёрдым пераплёце і аздоблена шматлікімі фотаздымкамі.

Творчасць Алеся Салаўя, таксама як і вышэй згаданых паэтаў-эмігрантаў, належыць да ліку напаўпадпольнай літаратуры, яна быццам існуе, а быццам і не. У кнізе «Акно для матылькоў» Міхась Скобла параўноўвае беларускую эміграцкую літаратуру з незгасальным падземным агнём торфу: агонь гэты тушаць і пажарнікі, і залілныя дажджы, а ён усё гарыць. І прыходзіць час — вырываецца на паверхню, палыхнуўшы з падвойнай сілай.

Балотны агонь — вельмі трапная метафара творчасці Алеся Салаўя, якая належыць Ларысе Геніюш. Іхнія творы ўжо чытаюць, нягледзячы на дарэмныя намаганні таталітарных «пажарнікаў».

На Беларусі цікавае і змястоўнае даследаванне жыцця і творчасці Алеся Салаўя здзейсніла пісьменніца, педагог, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі Лідзія Савік у нарысе «Жыву і дыхаю, мой край, табой…», змешчаным у яе кнізе «Пакліканыя».

## Сын «ворагаў народу»

Сапраўднае прозвішча Алеся Салаўя — Альфрэд Радзюк, а нарадзіўся ён 1 мая 1922 года ў вёсцы Крысава, што ў шасці кіламетрах ад Койданава (Дзяржынска).

Мне неаднаразова даводзілася наведваць гэтую вёску, размешчаную на беразе ракі Вусы. Старыя ліпы на ўскраіне вёскі, шматлікія буслянкі, рэчка — усе гэтыя маляўнічыя краявіды з дзіцячых гадоў зачароўвалі малога Альфрэда, якога бацькі і сябры клікалі ласкава Фрэдзя.



«Партрэт паэта Алеся Салаўя», 1994. ДВП, алей. 40х30 см

Вершы хлопчык пачаў складаць з васьмігадовага ўзросту, і першымі добразычлівымі яго слухачамі і «крытыкамі» былі высокаінтэлігентныя бацька Васіль Раманавіч і маці Марыя Сяргееўна. Бацька паэта атрымаў вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю, працаваў у вёсцы Самахвалавічы, на Чэрвеньшчыне (Натальеўск), у вёсцы Вялікія Навасёлкі (Койданаўшчына), а ў 1934 годзе сям'я пераехала ў Койданава, дзе Васіль Раманавіч займаў пасаду загадчыка гандлёвага аддзелу Койданаўскага райспажыўсаюза. Фрэдзя вучыўся ў Койданаўскай сярэдняй школе разам з вядомым у будучым гісторыкам Міколам Ермаловічам, ураджэнцам вёскі Малыя Навасёлкі.

Усе раннія юнацкія вершы Алеся Салавей прысвяціў роднаму краю, захапленню прыродай. У 1937 годзе яго першыя вершы («На сенажаці», «Шылава гара», «Ты», «Выйдзі, паслухай») з'явіліся на старонках часопіса «Піянер Беларусі» і раённай газеты «Ударнік Дзяржыншчыны».

Чорнай жнівеньскай ноччу ў тым жа 1937-м на яго вачах, а таксама трох малодшых дзяцей (двух братоў і сястры), органамі НКУС былі арыштаваны бацька і маці. Іх Альфрэд больш ніколі не ўбачыць.

Гартаю кнігу «Памяць. Дзяржынскі раён»: Радзюк Васіль Раманавіч расстраляны ў Мінску 10 студзеня 1938 года. Рэабілітаваны ў маі 1960-га. Парэшткі яго знаходзяцца, верагодней за ўсё, у сумнавядомых Курапатах. Маці, Марыя Сяргееўна, асуджана на 10 гадоў зняволення, рэабілітавана 8 студзеня 1956 года. Адбыўшы поўны тэрмін зняволення, яна рана пайшла з жыцця і пахавана на могілках у вёсцы Вязань, што побач з Фаніпалем.

Пасля гэтай трагедыі ў школе Альфрэд з'яўляўся рэдка, бо трэба было зарабляць на хлеб, працуючы на торфараспрацоўках, вывазцы лесу, разгрузцы вагонаў. У верасні юнак паступіў вучыцца ў Мінскае педагагічнае вучылішча, якое не скончыў з-за дрэнных жыццёвых умоў.

Летам 1938 года Альфрэд Радзюк быў запрошаны на курсы маладых аўтараў, дзе пазнаёміўся з паэтамі Міколам Аўрамчыкам, Аркадзем Куляшовым. Заняткі на курсах праводзілі Пятро Глебка і Кузьма Чорны. Такім чынам, Алеся Салаўя можна лічыць паэтам-самавукам. Ці да навукі было тады яму, узяўшаму клопаты пра братоў і сястру? Да пачатку вайны Алесь нейкі час працаваў у рэдакцыі лагойскай раённай газеты «Чырвоная Лагойшчына». На фронт яго не ўзялі з прычыны хворага сэрца і кепскага зроку.

Перад прыходам немцаў ён напісаў верш «Відаць, забыў Напалеона», у якім кляйміў Гітлера і яго кліку. Верш трапіў у рукі немцаў, паэт быў арыштаваны і пасаджаны ў турму, з якой ледзь выбраўся. Але і да партызан не прыстаў: яго, сына «ворагаў народа», мог у партызанскім атрадзе прыстрэліць які-небудзь Хрумкач—Крумкач (антыгерой аповесці А. Рыбака «Хрумкач»).

## Вайна

Увосень 1941 года паэт пакідае Лагойск, пераязджае ў Мінск і ўладкоўваецца ў рэдакцыю «Беларускай газеты», дзе працавала паэтка Наталля Арсеннева, вернутая з казахстанскай ссылкі з двума сынамі. Друкуецца ў газетах пад псеўданімамі Алесь Вясновы, Алесь Вясёлка, а свой верш «Радасць жыцця» ён упершыню надрукаваў пад псеўданімам Алесь Салавей. Давялося паэту працаваць і ў гарадскім пасёлку Ільля, што на Вілейшчыне, дзе ім былі напісаны вершы «Маці чакае сына з вайны», «Спі, мой родны». У вершы «Беларусі», напісаным паэтам там жа, ёсць такія радкі: «За цябе маё сэрца балела, \\ дарагая мая Беларусь». Тэма патрыятызму гучыць і ў іншых вершах Алеся Салаўя. Шмат вершаў ён прысвяціў Усяславу Чарадзею, Францыску Скарыну, Сымону Буднаму, Максіму Багдановічу, услаўляў мясціны, дзе давялося яму пабываць (Мінск, Лагойск, Вільня, Маладзечна, Койданава).

У Рызе Алесь Салавей працаваў намеснікам галоўнага рэдактара беларускага часопіса «Новы шлях». Тут пабачыў свет яго паэтычны зборнік «Мае песні».

Падчас наступлення Савецкай Арміі Алесь Салавей пакручастым шляхам з Рыгі трапляе ў Берлін. Ён ведае, што ад вызваліцеляў яго чакае, як і бацьку, расстрэл, хаця паэт не адчуваў за сабой ніякай віны перад савецкай уладай, хутчэй наадварот, перад ім была вінаватая ўлада, якая асірацiла яго і яговых братоў і сястру.

У Берліне, у логаве фашыстаў, ён напісаў верш «Frohliche Weihnachten», што ў перакладзе азначае пажаданне «Вясёлых Каляд!». У гэтым вершы ёсць такія радкі, што праклінаюць фашыстаў: «Карае вас, карае Божы меч \\ ліхіх бясчынных». У той час яшчэ дыміліся печы Бухенвальда і Дахаў, куды мог бы патрапіць паэт, калі б гэты верш трапіў у рукі немцаў.

## Эмігрант

Пасля Берліна Алесь Салавей кароткім заездам наведаў Прагу, дзе адбылася яго сустрэча з Ларысай Геніюш, і неўзабаве апынуўся ў Аўстрыі (Зальцбург), дзе да 1949 года прабыў у лагеры для выгнанцаў. Тут ён ажаніўся з Зінаідай Кадняк і стаў бацькам сына Міхася і дачкі Ганны.

Гэты перыяд жыцця Алеся Салаўя незвычайна плённы ў паэтычных адносінах. За гэты час ён напісаў паэмы «Домік у Менску», «Звіняць званы Святой Сафіі», «Сын», тут убачыў свет зборнік паэзіі «Сіла гневу». У адным з вершаў паэта «Мая Беларусь», уключаным у гэты зборнік, ёсць такія цудоўныя радкі, у якіх бачна яго шчырая любоў да Беларусі: «О, мая Беларусь! Хто з табой, той — шчаслівы, \\ краю лепшага той, хто шукаў — не знайшоў». Тэмы любові і тугі паэта па Беларусі гучаць і ў вершы «Не пакіну»: «Цяжка тут без цябе на чужыне, \\ О, Матуля, старонка мая!»

У 1949 годзе Алесь Салавей з сям'ёй выехаў у Аўстралію. У Мельбурне набыў кавалак зямлі, пабудаваў уласны дом і ўвесь час працаваў на фабрыцы. У Аўстраліі ў яго сям'і нарадзіўся яшчэ адзін сын — Юрка. У вершах, напісаных на далёкай чужыне, — боль паэта па страчанай роднай Беларусі. «На моры-хваль віры. Між іх знайшоў спакой \\ нязнаны спыну сум — адзіны сябра мой» (верш «Сум»).

Красамоўная дэталь: жывучы на далёкім кантыненце, паэт не прысвяціў яму ні аднаго верша, жыў надзеяй на вяртанне ў вольную незалежную Беларусь. Яго вельмі падтрымлівала ліставанне з Ларысай Геніюш, калі яна жыла пасля вызвалення са сталінскага ГУЛАГу ў Зэльве. Выдатная паэтка дасылала Алесю Салаўю кнігі Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Ніла Гілевіча. У 1952 годзе паэт падрыхтаваў да друку рукапісы двух новых сваіх зборнікаў: «Вянкі» і «Несмяротнасць», якія выйшлі ў свет ужо пасля яго смерці. Найвялікшым сваім скарбам Алесь Салавей лічыў родную пявучую беларускую мову.

Памёр Алесь Салавей 22 студзеня 1978 года ў Мельбурне, у час купання ў акіяне ад разрыву сэрца. Там жа, у Мельбурне, на Беларускіх могілках, і пахаваны.

## Вяртанне паэта

Першая прэзентацыя кнігі «Алесь Салавей» адбылася на радзіме паэта, у Дзяржынску (Койданаве), у чытальнай зале Дзяржынскай раённай бібліятэкі. Усе бібліятэкі раёна набылі кнігі свайго выдатнага земляка.

А ў лістападзе адбылася прэзентацыя гэтай кнігі ўжо ў сталіцы, ва ўтульнай зале Дзяржаўнага музея гісторыі старажытнай беларускай літаратуры. Нягледзячы на свой сталы ўзрост, на прэзентацыю прыйшоў патрыярх беларускай паэзіі паэт Мікола Аўрамчык, які расказаў пра асабістае знаёмства з Алесем Салаўём. Лідзія Савік, якая вяла перапіску з жонкай Алеся Салаўя, Зінаідай Кадняк і была асабіста знаёма з паэтамі-эмігрантамі Масеем Сяднёвым і іншымі, адзначыла, што за мяжой знаходзіцца шмат архіўных матэрыялаў і твораў паэтаў-эмігрантаў, якія прадстаўляюць вялікую каштоўнасць і павінны знаходзіцца на Беларусі. Вярнуць гэтае багацце на Радзіму — святы абавязак работнікаў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

У прамовах усіх выступоўцаў — Генадзя Бураўкіна, Сяргея Панізніка, Валянціны Трыгубовіч і іншых — гучала, што творы Алеся Салаўя павінны вывучацца ў школе і мусяць друкавацца дзяржаўнымі выдавецтвамі. Сваім паэтычным талентам паэт назаўсёды застаўся ў беларускай літаратуры. Час замоўчвання літаратурнай спадчыны паэта Алеся Салаўя, як і паэткі Ларысы Геніюш, іншых паэтаў-эмігрантаў, прайшоў. З выхадам у свет кнігі «Алесь Салавей» пра гэтага цудоўнага паэта будзе ведаць і будзе яго чытаць уся наша сапраўды незалежная ў недалёкім будучым Беларусь. А гэты час прыйдзе!

▶ ДЫСКУСІЯ

# СВОЙ ПОГЛЯД

Аляксей ХАДЫКА

**У нумары «НЧ» за 17 снежня была надрукавана рэцэнзія кінакрытыка Андрэя Расінскага «Сонечка ў ступары», прысвечаная выдатнай, на мой погляд, пастаноўцы Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі паводле «Злачынства і пакарання».**

Мне давялося прысутнічаць на закрытым праглядзе спектакля 15 снежня 2010 года, таму мае ўражанні — вынік непасрэднага знаёмства з п'есай і яе сцэнічнай інтэрпрэтацыяй рэжысёрам Ігарам Сігавым, інсцэніроўшчыкам Аленай Паповай і пастаноўшчыкам Валерыем Анісенкам. Ці варта пераказваць знаёмы ўсім са школьнай праграмы змест? Гутарка ідзе пра змаганне дабра і зла, неадваротнасць пакарання за фаўстыянскае жаданне паставіць сябе вышэй натоўпу і дазволіць сябе недазваляльнае.

Аўтарскі калектыў дзеля пластычнага рашэння п'есы «пажаніў» Дастаеўскага… з фільмам «Вестсайдская гісторыя»! Тое, што падалося «шальнымі зонгамі і бязгустоўна-кашмарным карнавалам» — папросту рэінкарнацыя пластыкі «Вестсайдскай гісторыі», тых кінематаграфічных плясак амерыканскіх бандытаў. Памятаеце незабывальную рэпліку: «Акулы смярдзяць!», сказаную прадстаўніком адной групоўкі да іншай. Толькі ў беларускай рэальнасці смярдзяць, як бы сказаць мякчэй, «карабасы-барабасы». Тыя, якія на старушку-Еўропу (прабачце, проста «старушку-працэнтніцу») спрабуюць лезці з сякерай. Магчыма, гэтая паралель камусьці падасца нацягнутай.

Але схадзіце на спектакль і займейце свой пункт гледжання. Мой жа наступны: гэта пастаноўка не моцартыянцкая (можа, трошкі не хапае перабіўкі рытму), затое бетховіянская. За кошт выверанай матэматычнай гармоніі ўвасаблення ідэі: у пластыцы, руху, агульнай кампазіцыі. Паверце мне як чалавеку, які скончыў спецыяльную матэматычную школу №50 г. Мінска.

Да таго ж дазвольце павіншаваць Ігара Сігава з чарговым днём нараджэння (30 снежня), а Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі — з 20-годдзем (21 студзеня). У гэты дзень плануецца капуснік — уваход вольны.

▶ ПАМЯЦЬ

# УШАНАВАЛІ ПАКУТНІКА

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Супольнымі намаганнямі грамадскасці была ўшанавана памяць патрыёта Беларусі ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага, расстралянага немцамі ў час другой сусветнай вайны.**

У мястэчку Трасцянец на адным з месцаў расстрэлу вязняў канцлагера быў устаноўлены крыж Ефрасінні Полацкай, аздоблены надпісам «Святы пакутнік Беларусі айцец Вінцэнт Гадлеўскі». Побач паўстала копія Вострай брамы, аздобленая надпісам: «Божа, барані Беларусь».

Асноўныя падзеі прайшлі на каталіцкія Каляды. У гэты дзень адбылося асвячэнне помнікаў, якія ўласнымі рукамі і на ўласныя сродкі здзейсніў Анатоль Белы (кіраўнік клуба «Спадчына»), скульптары Уладзімір Каралацкі і Алесь Цыркуноў.

## Даведка

Гадлеўскі Вінцэнт [Вікенцій Іванавіч; 16.11 (паводле іншых звестак 16.12).1888, мяст. Поразава (паводле іншых звестак в. Шурычы) Ваўкавыскага пав. Гарадзенскай губ., цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. — 24.12.1942, Трасцянец пад Мінскам], рымса-каталіцкі святар, публіцыст, перакладчык, выдавец, педагог. У 1912-м скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю, у 1916 — Мітрапалітальную духоўную акадэмію ў Петраградзе. Пасвечаны ў святары 3.6.1914. Служыў вікарыем пры кафедральным саборы ў Мінску. Удзельнік 1-га Усебеларускага з'езду. У 1918-м уваходзіў у склад Рады БНР. Адзін з заснавальнікаў і лідараў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. За актыўную нацыянальна-палітычную дзейнасць арыштоўваўся польскімі ўладамі 25.6.1925 (зняволены ў віленскай турме Лукішкі), 30.9.1925. 1.3.1926 асуджаны на 2 гады пазбаўлення волі (зняволенне заменена штрафам). Арыштаваны ў сакавіку 1927-га; асуджаны на 2 гады зняволення, якія адбыў у Макатоўскай турме ў Варшаве. З 1929 жыў у Вільні. Заснавальнік Беларускай Незалежніцкай Партыі. У чэрвені 1941 увайшоў у склад створанага ў Берліне Беларускага нацыянальнага цэнтру. 3 верасня 1941-га ў Мінску; галоўны школьны інспектар пры Генеральным камісарыяце Беларусі, сябра Галоўнай Рады Беларускай Народнай Самапомачы. Ініцыяваў стварэнне падпольнай арганізацыі «Беларускі Цэнтральны Фронт», якой кіраваў. Спрабаваў заснаваць кіруючы цэнтр Беларускага Рэзыстансу. Арыштаваны СД у Менску 24.12.1942 і ў той жа дзень расстраляны ў Трасцянцы.

▶ КІНО

# БЕЛАРУСКІЯ ГІСТОРЫІ ДЛЯ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Андрэй РАСІНСКІ

**Напрыканцы мінулага года на экран выйшлі дзве расійскія карціны, значны ўдзел у якіх узялі беларусы. «Ёлкі» і «Брэсцкая крэпасць» — вельмі розныя стужкі. Адна — навагодняя камедыя. Другая — пафасная ваенная драма. Але іх яднае тое, што беларускія гісторыі напоўніцу выкарыстоўваюцца для сучаснай расійскай прапаганды.**

Навагодняя камедыя «Ёлкі» — быццам бы па-за ўсялякай ідэалогіяй. Але стужку можна разглядаць як самы ўдалы рэкламны ролік прэзідэнта Мядзведзева.

Сірата з дзіцячага дому зусім заблыталася. Маленькая дзяўчынка ўсім нахлусіла, што яе тата — прэзідэнт. Цяпер з няшчаснай кпяць і патрабуюць доказаў: у навагоднім звароце расійскі прэзідэнт мусіць сказаць ключавую фразу пра Дзеда Мароза. Знаёмы хлопчык абяцае, што праз шэсць выпадковых людзей просьба дзяўчынкі дойдзе да адрасата.

І закруціліся навагоднія прыгоды. Папулярную спявачку таксіст-фанат выратоўвае ад прадзюсара. Самотная прыгажуня марыць знайсці сваё шчасце — і знаходзіць дальнабойніка, які носіць яе на руках. Небарака-прагаголік спяшаецца да каханай — і падазрае суседа па самалёце ў амурах са сваёй дзяўчынай.

Каб знайсці сюжэты, кінастудыя абвясціла конкурс: гледачы самі дасылалі навагоднія гісторыі і анекдоты. Іх назбіралася пад 20 000. Сцэнарысты анекдоты апрацавалі. Расійскі кліпавы творца Цімур Бекмамбетаў прыстуціў да здымак.

Вялікі ўдзел у стужцы прыняў беларускі сцэнарыст Андрэй Курэйчык. Ён склаў тры гісторыі з шасці. Каронная тэма Курэйчыка, з падменамі, адразу распазнаецца: злодзей выдае сябе за міліцыянера і мусіць спыніць рабаўнікоў: фальшывых Снягурку і Дзеда Мароза. Але беларускія матывы нятоеснасці, прыстасавання і «ваўкалацтва» (як у мінулагодняй «Масакры»!) — падпарадкаваныя расійскадзяржаўнаму шчасцю.

Замест Раства Хрыстова — абжорнае свята Новага года. Замест Калядных цудаў — спажывецка-кліпавыя радасці з шампанскім, мандарынамі і салатай Аліўе. Замест Бога — чарговы крамлёўскі небажыхар, здольны пачуць любую дзяўчынку і апошняга гастарбайтэра.

Фінальныя кадры «Ёлак» эмблематычныя. Уся Расія спіць пасля святаў. І толькі ў Крамлі гарыць святло. У асветленым акенцы — сілуэт прэзідэнта. Ён думае пра народ і з далечыні мудра ўглядаецца ў занатаваныя на снезе просьбы, каб іх выканаць, як найлепшы цудатворца.

Беларускі імпэт і прыдумкі, пацешныя досціпы пайшлі на ахайную спажыву імперскаму стоду.

У выпадку з іншай карцінай такой спажывай сталася нядаўняя гісторыя «Брэсцкай крэпасці».

Стужка Аляксандра Ката заяўлена як першы фільм Саюзнай дзяржавы. Гэта сумесная вытворчасць Расіі і Беларусі.

У фільме хлопчык Саша, які стаў сведкам ваенных дзеянняў, расказвае пра абарону крэпасці ад нацыстаў. Супраціў ачольваюць камандзір Пётр Гаўрылаў, камісар Яфім Фамін і кіраўнік памежнай заставы Андрэй Кіжаватаў.

У Расіі карціну абвясцілі шэдэўрам; гледачы захлынаюцца ад патрыятызму. Але стужка — вялізны пластмасавы кліп, які граматна выціскае слёзы. Замаруджана-вайсковыя сцэны, выбуховая бутафорыя, крыху знявечаных целаў. Кампутарныя эфекты разбаўляюцца жменькай чалавечых эмоцый: страх, нянавісць, клопат, любоў.

Але гэта эмоцыі не людзей, а алаўяных жаўнерыкаў, якія мусяць быць знішчаныя ў чарговым эпізодзе. Вас толькі зачапілі выбухам, ледзьве стукнулі чалавечай рэакцыяй на бяду; досыць — пяройдзем да іншага пункту праграмы.

З «Брэсцкай крэпасці» тырчаць не столькі гламурна-галівудскія вушы, калі рэжысёр безнадзейна спрабуе паўтарыць подзвігі жаўнера Раяна дый эфекты «Пёрл-Харбару», але беларусьфільмаўскія мілітарныя радасці.

Танк едзе па целах, дзяўчынка сядзіць з адкрытым ротам — вітайце крыху ачалавечаны «Дняпроўскі рубеж». Акцёр Анатоль Кот грае чарговага шпега — ну як не прыгадаць тут «Шчыт Айчыны» пра заходніх нягоднікаў на Беларусі!

«Брэсцкая крэпасць» зроблена са значна большым майстэрствам за беларускі вайсковы трэш мінулых гадоў, але гэта не адмяняе яе штучнасці.

Савецкі сцяг на целе хлопчыка, які занураецца ў чырвоны золак; сталёвая непахіснасць; вайнушка з кампутарнымі эфектамі — і з геройчнымі, амаль нязменнымі грымасамі. На гэтым свяце Саюзнай дзяржавы няма месца ані для Беларусі, ані для глыбокіх эмоцый.

Але, як бы там не было, «Ёлкі» і «Брэсцкая крэпасць» — жывейшыя за іншыя расійскія стужкі.

З суседскай імітацыяй велічы ўсё настолькі кепска, што ім патрэбная беларуская сыравіна.

### Елкі




Расія, 2010, каляровы, 90 хв.

Рэжысёры: Цімур Бекмамбетаў, Аляксандр Вайцінскі, Дзмітры Кісялёў, Аляксандр Андрушчанка, Яраслаў Чыжэўскі, Ігнас Ёнінас

Ролі выконваюць: Іван Ургант, Сяргей Светлакоў, Вера Брэжнева, Сяргей Гармаш, Артур Смальяніnaў, Кацярына Вілкава, Марыя Сімакіна, Сяргей Пахадаеў, Віктар Вяржбіцкі

Жанр: навагодняя камедыя паводле сцэнару Андрэя Курэйчыка, Цімура Бекмамбетава, Дзмітрыя Алейнікава і інш.

### Брэсцкая крэпасць

Расія–Беларусь, 2010, каляровы, 131 хв.

Рэжысёр: Аляксандр Кот

Ролі выконваюць: Аляксей Капашоў, Андрэй Мярзлікін, Павал Дзеравянка, Аляксандр Коршунаў, Яўген Цыганоў, Юры Анпілогаў

Жанр: ваенны фільм




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 12

Падпісана да друку 05.01.2011. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.